ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА



Яна скарае вяршыню за вяршыняй, але не збіраецца спыняцца на дасягнутым. У гэтым ёй дапамагае каласальная працаздольнасць і, у немалой ступені, шанцаванне. Магчыма, аснова поспеху Сашы Паўлавай у тым, што яна заўсёды рабіла толькі тое, што прыносіла ёй задавальненне.



Значным дасягненнем галіновы прафсаюз лічыць прывязку памеру стыпендый да тарыфнай стаўкі першага разраду. Такі падыход значна спрасціў парадак вылічэння стыпендый і паспрыяў іх аператыўнаму пераразліку.

## ЦЫТАТА ДНЯ



Старшыня ТРА Саюзнай дзяржавы Ігар УГОЛЬНІКАЎ:

*Расіі і Беларусі неабходна аб'ядноўваць намаганні ў сферы кінематографа. Для Беларусі, як і для Расіі, актуальная праблема даверу гледачоў да айчыннага кінематографа, што аказвае істотны ўплыў на пракатнае жыццё кінастужак. Можна рабіць агульнае расійска-беларускае кіно і не аддзяляць спецыялістаў дзвюх краін у кінасферы, а наадварот, правільна спалучаць іх вопыт і прафесіяналізм. Я бачу тут перспектывы...*

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | +10° |
| Віцебск | +7° |
| Гомель | +3° |
| Гродна | +8° |
| Магілёў | +7° |
| Мінск | +7° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.10.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8550,00 | ▲ |
| Еўра | 10910,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 271,50 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1044,59 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

10 ЛІСТАПАДА 2012 г. СУБОТА № 217 (27332) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## Жывая зямля

**Дзякуючы вядучаму навуковаму супрацоўніку навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па біярэсурсах Анатолю Аляхновічу (на фотаздымку) адбылася цікавая і вельмі важная прыродаахоўная акцыя: упершыню ў Беларусі прайшло «перасяленне» прадстаўніка фауны з ліку «чырванакніжнікаў» — шыракапалага рака. Гэты спецыяліст уласнаручна адлавіў каля трох соцень асобін ракаў і перавёз у Глыбоцкі раён, каб захаваць і памножыць унікальную папуляцыю нашага жывёльнага свету. І таму ёсць надзея, што на Зямлі не знікне яшчэ адзін від.**



# НА БЕЛЫМ ХУТКА «ЧЫРВАНАКНІЖНІК» СВІСНЕ!



Фотаздымкі Анатоля КЛЕШЧУКА.

Месцам адлову ракаў-«чырванакніжнікаў» стаў адзін са штучных вадаёмаў Маладзечанскага раёна. А месцам іх новай «дыслакацыі» — Глыбоцкі. Незвычайнае перасяленне выклікана неабходнасцю захавання папуляцыі гэтага віду беларускай фауны, бо ён знаходзіцца на мяжы знікнення. Яшчэ ў 1981 годзе беларускія навукоўцы-заолагі забілі трывогу і дамагліся, каб прадстаўнік дзесяціногіх быў занесены ў Чырвоную кнігу. Але адна справа — захаваць, не менш важная — паспрыяць памнажэнню і рассяленню віду. А таму пры падтрымцы ПРААН/ГЭФ «Інтэграцыя пытанняў захавання біяразнастайнасці ў палітыку і практыку тэрытарыяльнага планавання ў Беларусі» ўзнік спецыяльны праект і акцыя пад назвай «Захаваем шыракапалага рака ў Беларусі». Глыбоцкі раён, у якім знаходзіцца 106 азёраў, лепш за іншыя рэгіёны падышоў для гэтага прыродаахоўнага праекта.

— Глыбоччына была дасканала вывучана падчас даследавання біялагічнай і ландшафтнай біяразнастайнасці, — патлумачыў менеджар праекта Уладзімір Калтуноў. — Вывучаючы флору і фауну 36 азёр, мы прыйшлі да высновы, што толькі ў адным з іх захавалася папуляцыя шыракапалага рака. Мы выбралі два прыродныя вадаёмы, якія найбольш адпавядаюць неабходным умовам. Гэта возера Белае (адно з чатырох з такой назвай) і Млічына. Перш за ўсё яны бясcцёкавыя, а значыць, не злучаюцца пратокамі і ручаямі з іншымі вадаёмамі і абаронены ад трапляння ў іх розных інфекцый, у тым ліку і ракавай чумы, якая ўжо неаднойчы вынішчала гэтых панцырных насельнікаў.

— Унікальнасць акцыі і ў тым, што ў далейшым папуляцыя глыбоцкага рака можа стаць сапраўдным гадавальнікам для правядзення маштабных праектаў па захаванні рэдкага віду, — паведамілі навуковыя супрацоўнікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, эксперты гэтага праекта Аркадзь Скуратовіч і Міхаіл Максіменкаў.

Прыродаахоўная акцыя не засталася незаўважанай у раёне, бо ў ёй удзельнічалі мясцовыя дзеці — вучні Псуеўскай і Зябкаўскай школ. Арганізатары праекта, сярод якіх Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі, лічаць, што дзеці будуць не толькі ганарыцца тым, што далучыліся да вельмі важнай справы захавання навакольнага асяроддзя. У будучым юныя памочнікі самі стануць добрымі захавальнікамі і сапраўднымі абаронцамі матухны-прыроды.

СТАР. 4

## Супрацоўніцтва

### ЛЕНІНГРАДСКАЯ ВОБЛАСЦЬ ЦІКАВАЯ БЕЛАРУСІ

**Беларусь пераарыентуе перавалку вялікіх аб'ёмаў грузаў з партоў краін Балтыі на парты Ленінградскай вобласці. Аб гэтым учора на сустрэчы з губернатарам Ленінградскай вобласці Аляксандрам Драздзенкам заявіў кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

«Мы вельмі сур'ёзна абмяркоўвалі гэту тэму на апошняй сустрэчы з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным. Мы прынялі прынцыповае рашэнне аб пераарыентацыі вялікіх аб'ёмаў грузаў, у тым ліку калійных угнаенняў, з партоў балтыйскіх дзяржаў на вашы парты. Нам трэба вельмі сур'ёзна прапрацаваць гэту тэматыку.

СТАР. 2

## Быць гаспадаром

### ЗАСЫПАЛА ЯБЛЫКАМІ

**Яблыкі на любы густ і кашалёк прапануюць сёння магілёўскія рынкі. Прадукцыя прамысловых садоў сельскагаспадарчых прадпрыемстваў пакладзена ў сучасныя сховішчы.**

#### ЧЫРВОНЫ, ЖОЎТЫ, ЗЯЛЁНЫ

Такой разнастайнасці яблыкаў, як сёлетняй восенню — розных колераў, формаў і смаку, — даўно не было. Можна нават разгубіцца. Але і выбраць — прыдзірліва і па ўласным гусце. Гандаль даўно адышоў ад састарэлага савецкага стэрэатыпу «проста яблык, бярыце што ёсць» і цяпер прапануе канкрэтныя гатункі: бананавыя, сунічныя, грушавыя, «лоба», «антэй» і гэтак далей.

СТАР. 2

## Падзея «Лістапада»

### «БЫКАЎ — ВЕЛЬМІ ВАЖНЫ ПІСЬМЕННІК»

**У чалавечых душах ідзе вайна. І неабавязкова тады, калі гучаць стрэлы, іравуцца снарады, дрыжыць зямля. Яна можа быць асабістай — калі кожны вырашае для сябе, хто ёсць яго вораг і чаму. Яна можа ісці і ў самім чалавеку, калі ў ім змагаюцца натуральнае імкненне выжыць і ўсведамленне немагчымасці гэтага ў пэўных умовах. Васіль Быкаў пісаў пра вайну. Наша апошняя вайна скончылася больш за 60 гадоў таму. Але вайна, якую паказаў Быкаў, можа ісці ў чалавеку ўвесь час... Таму яго творы дагэтуль чытаюць і ведаюць ва ўсім свеце.**

СТАР. 5

## ВАДЗІМ ЗАЙЦАЎ ВЫЗВАЛЕНЫ АД ПАСАДЫ СТАРШЫНІ КДБ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка вызваліў генерал-лейтэнанта Вадзіма Зайцава ад пасады старшыні КДБ. Адпаведнае рашэнне прынята па выніках нарады ў кіраўніка дзяржавы, на якой разглядаліся перспектывы і недахопы ў рабоце Камітэта дзяржбяспекі, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

Па выніках нарады дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Леанід Мальцаў адзначыў, што ў сваіх выступленнях генеральны пракурор і старшыня Следчага камітэта паставілі шэраг пытанняў. У прыватнасці, яны датычыліся апошніх падзей, звязаных з Камітэтам дзяржаўнай бяспекі. «Усім вядома аб самагубстве падпалкоўніка КДБ Аляксандра Казака. Ёсць і шэраг іншых пытанняў, якія патрабуюць дасканалага расследавання», — заявіў Леанід Мальцаў.

«У сувязі з гэтым Прэзідэнт прыняў рашэнне вызваліць генерал-лейтэнанта Вадзіма Зайцава ад пасады старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі і залічыць яго ў распараджэнне старшыні КДБ», — паведаміў дзяржсакратар Савета бяспекі.

«Выконваць абавязкі Старшыні КДБ дaручана мне. Але гэта не значыць, што Вадзім Зайцаў пасля завяршэння расследавання не можа вярнуцца на гэту пасаду. Калі расследаванні пакажуць кампетэнтнасць яго і іншых службовых асоб, то несумненна ён будзе вернуты на гэту пасаду. Гэта зроблена для таго, каб расследаванне было праведзена максімальна аб'ектыўна, — удакладніў Леанід Мальцаў. — Расследаванне даручана праводзіць генеральнаму пракурору. Таксама да гэтай работы будзе падключаны Следчы камітэт».

## ЛЕНІНГРАДСКАЯ ВОБЛАСЦЬ ЦІКАВАЯ БЕЛАРУСІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Прэзідэнт Расіі аднaзначна падтрымаў гэту ініцыятыву. Нам трэба дамовіцца з чыгуначнікамі Беларусі і Расіі і хутчэй рэалізаваць гэтыя дамоўленасці», — сказаў беларускі лідар.

Як адзначыў кіраўнік дзяржавы, Беларусь знаходзіцца на скрыжаванні транзітных шляхоў паміж Усходам і Захадам, а Ленінградская вобласць мае магутны транспартна-лагістычны патэнцыял у выглядзе чатырох марскіх партоў. «Гэта для нас цікава з пункту гледжання рэалізацыі сумесных транзітных праектаў, у тым ліку ўзаемнай перавалкі тавараў у трэція краіны марскім і сухапутным шляхам», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

У сваю чаргу губернатар Ленінградскай вобласці адзначыў, што неабходна дамовіцца аб справядлівых тарыфах. «Калі нам удасца зрабіць справядлівыя тарыфы або, як мы гаварылі з урадам Беларусі, каб тарыфы былі хаця б у нуль у параўнанні з краінамі Балтыі», — сказаў ён. «Эканоміі Ленінградскай вобласці, Расіі, Беларусі ад гэтага толькі выйгралі б. Мы сёння гатовы праз нашы партовыя збудаванні перавальваць і тэхніку, і мінеральныя ўгнаенні, і нафтапрадукты, і шмат іншага. Мы павінны максімум прыкласці намаганняў для таго, каб былі справядлівыя тарыфы», — рэзюмаваў Аляксандр Драздзенка.

## КАМФОРТНЫЯ ЎМОВЫ ДЛЯ БІЗНЭСУ

**Урад Беларусі гатовы стварыць камфортныя ўмовы для больш актыўнай работы бізнэсу Казахстана на беларускім рынку**

Аб гэтым заявіў учора ў Астане на беларуска-казахстанскім дзелавым форуме прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Кіраўнік урада адзначыў магчымасць больш актыўнай прысутнасці казахстанскіх кампаній на рынку Беларусі як рэзідэнтаў. «Мы будзем ствараць усе неабходныя камфортныя ўмовы, каб казахстанскім кампаніям было эканамічна эфектыўна працаваць у Беларусі», — заявіў ён.

Казахстан выйшаў на трэцяе месца па тавараабароту з Беларуссю пасля Расіі і Украіны. «З улікам аб'ёмаў паслуг мы, лічу, ужо ў бягучым годзе можам выйсці на $1 млрд. па ўзаемным гандлі, і наш патэнцыял значна перавышае гэты ўзровень», — падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч.

## ЦЁПЛЫ І ВІЛЬГОТНЫ ЛІСТАПАД

**У выхадныя на тэрыторыю Беларусі завітае антыцыклон з боку Скандынаўскага паўвострава, паведаміла рэдакцыі галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Людміла Парашчук.**

У сярэдзіне дня цэнтр антыцыклону будзе ўжо над Мінскам, а ў нядзелю ён адыдзе далей на ўсход Украіны. Таму ў суботу ападкаў ужо не будзе. Тэмпература паветра ўдзень плюс 1—6 градусаў, а па паўднёвым захадзе да 7—9 цяпла. Не прагназуюцца дажджы і ў нядзелю. Тэмпература паветра ўначы 11 лістапада 0—плюс 5 градусаў, па ўсходзе да 1—3 марозу, удзень — плюс 2—7 градусаў, а па захадзе Брэсцкай і Гродзенскай абласцей да 8—10 цяпла. Разам з тым, у выхадныя ўзмоцніцца паўднёва-ўсходні вецер, парывы якога будуць дасягаць 14 м/с.

А вось у панядзелак праз тэрыторыю Беларусі пачне рухацца чарговы атмасферны фронт. Усюды чакаюцца дажджы. Уначы і раніцай месцамі туман. Тэмпература паветра ўначы 2—7 цяпла, удзень — плюс 4—9, па поўдні Брэсцкай і Гомельскай абласцей да 11 цяпла.

Паводле падлікаў айчынных спецыялістаў, у першай дэкадзе лістапада сярэднясутачная тэмпература была на 2—4 градусы вышэй за кліматычную норму. За першыя 9 дзён лістапада на паўночным захадзе ўжо выпала каля месячнай нормы ападкаў. Рэкордныя дажджы назіраліся ў гэты час у Вілейскім і Валожынскім раёнах, дзе выпала амаль 120 працэнтаў месячнай нормы ападкаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў, будзе аднолькава цёпла ў нас і надалей, бо ў бліжэйшы тыдзень зімовае надвор'е на тэрыторыю Беларусі яшчэ не завітае.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ІНФЛЯЦЫЯ Ў КАСТРЫЧНІКУ СКЛАЛА 1,8 ПРАЦЭНТА

**Аб гэтым паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Нацыянальным статыстычным камітэце.**

Такім чынам, індэкс спажывецкіх цэн на тавары і паслугі ў кастрычніку 2012 года ў параўнанні з вераснем склаў 101,8 працэнта, са снежнем 2011 года — 118,1 працэнта. У верасні да жніўня гэты паказчык складаў 101,3 працэнта. Паводле прагнозу на 2012 год, інфляцыя ў Беларусі запланавана на ўзроўні 19-22 працэнтаў.

Цэны на харчовыя тавары ў кастрычніку ў параўнанні з вераснем павялічыліся на 2,3 працэнта, індэкс цэн вытворцаў прамысловай прадукцыі ў кастрычніку 2012 года ў параўнанні з вераснем склаў 101,8 працэнта, цэны вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі ў кастрычніку ў параўнанні з вераснем узраслі на 1,1 працэнта, тарыфы на перавозку грузаў усімі відамі транспарту ў кастрычніку ў параўнанні з вераснем склалі 100,9 працэнта. Індэкс цэн і тарыфаў на платныя паслугі ў кастрычніку ў параўнанні з вераснем склаў 101,3 працэнта, са снежнем — 127,8 працэнта.

## АВАРЫЙНАЕ «ДАМІНО»



**На Магілёўскім мосце раніцай 8 лістапада ў дзвюх буйных аварыях пацярпелі 20(!) аўтамабіляў і пасажырскі аўтобус.**

А палове на сёмую раніцы сутыкнуліся 10 аўтамабіляў. Неўзабаве за сотню метраў ад першай аварыі адбылося сутыкненне 11 адзінак аўтатранспарту. Сярод іх — пасажырскі аўтобус і маршрутнае таксі. Людзі не пацярпелі, а вось аўтамабілі пашкоджаны, некаторыя з іх развозілі эвакуатары. Затор трымаўся некалькі гадзін.

**Алена КАЗЛОВА.**

## «ДРАЎЛЯНЫЯ» ЦЫГАРЭТЫ НА 722 МІЛЬЁНЫ РУБЛЁЎ

**На чыгуначнай станцыі Полацк днём у адным з крытых вагонаў грузавога саставу мытнікі і памежнікі знайшлі пад дровамі рэкордную колькасць кантрабанднага тытуню: 190 тысяч пачкаў цыгарэт маркі «Прэм'ер».**

Цягнік накіроўваўся з Полацка ў Даўгаўпілс. У суправаджальных жа дакументах на груз было адзначана, што ў краіну Еўрасаюза вязуць дровы ў палетах. Кантрабандысты пайшлі на хітрасць. Цыгарэты ў каробках былі выкладзены на паддоны, абкручаны чорнай поліэтыленавай плёнкай і схаваны пад колатымі дровамі. Кошт кантрабанднага тытуню ацанілі ў 722 мільёны рублёў.

У памежным ведамстве адзначаюць, што ў апошні час дзейнасць па нелегальнай перапраўцы цыгарэт у краіны Еўрасаюза актывізавалася.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ЗАСЫПАЛА ЯБЛЫКАМІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Са сваіх падсобных гаспадарак плады прадаюць вёдрамі і кучкамі, але сярэдні кошт — 5 тысяч рублёў за кілаграм. Драбнейшыя можна набыць за 3 тысячы, самыя буйныя і прыгожыя — за 8 тысяч.

На цэнтральным рынку ў Магілёве ёсць ужо і імпартны тавар, з Малдовы, але каштуюць прывазныя яблыкі прыкладна 10 тысяч рублёў. Народ, праўда, відавочна больш цікавіцца айчыннай прадукцыяй, а прадаўцы на настойлівыя пытанні аб краіне паходжання яблыкаў нібыта крыўдзяцца: «У нас беларускія!».

Ад рыначнай разнастайнасці відавочна адстаюць крамы. Кошт беларускіх яблыкаў у гандлі ў цэнтры Магілёва — каля 10 тысяч рублёў за кілаграм. Знайшліся і таннейшыя — каля 8 тысяч рублёў, але выгляд у іх быў не самы прэзентабельны. Асабліва ў параўнанні з галандскімі яблыкамі, якія ўражваюць сваімі памерамі і нагадваюць цацачныя. Кошт такой прыгажосці — 20 тысяч рублёў.

У фірменнай краме акцыянернага таварыства «Александрыйскае» Шклоўскага раёна прадаецца свая прадукцыя — добрыя яблыкі па 8,5 тысячы за кілаграм. Яны, дарэчы, былі тут у свабодным продажы ўсю мінулую зіму: не самыя танныя, па словах спажыўцоў, але сапраўды якасны тавар. Ды і спецыялісты ў вырошчванні і захоўванні садавіны раяць людзям набываць сваё: усё натуральнае, мінімум хімікатаў.

### НОВЫЯ САДЫ, ДАДАТКОВЫ ЎРАДЖАЙ

Вялікі ўраджай яблыкаў — гэта добра. Але вельмі важна яго захаваць і выкарыстаць разумна.

— Агульны ўраджай па ўсіх катэгорыях гаспадарак у Магілёўскай вобласці сёлета склаў 90 тысяч тон, — кажа намеснік старшыні камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Магілёўскага аблвыканкама Дзмітрый Ігнаценка.

З гэтай агульнай колькасці больш за 14 тысяч тон яблыкаў сабралі ў сельскагаспадарчых арганізацыях і фермерскіх гаспадарках. Тут размова ідзе пра новыя сады, сучасныя тэхналогіі вырошчвання і перспектыўныя гатункі.

— Ураджай з садоў, якія пасаджаны ў адпаведнасці з дзяржаўнай праграмай, будзе з кожным годам павялічвацца, — гаворыць Дзмітрый Ігнаценка. — Сады паступова ўваходзяць у сілу і будуць даваць добрую прадукцыю. Сёлета мы атрымалі ўжо на тысячу тон больш, чым мелі летась. А да 2015 года павінны атрымліваць з прамысловых садоў 52 тысячы тон прадукцыі.

Усе сабраныя яблыкі, падкрэсліваюць у камітэце па сельскай гаспадарцы, захоўваюцца ў спецыяльных сучасных сховішчах. Асеннія і зімовыя гатункі закладваюцца на халодны сезон і будуць трапляць да спажыўцоў у свой час.

Тысяча тон — гэта стабілізацыйны фонд, з якога вітамінную прадукцыю будуць атрымліваць у тым ліку сацыяльныя і дзіцячыя бюджэтныя ўстановы. Сёння з магілёўскага ўраджаю ў гандлёвыя сеткі паступаюць яблыкі на рэалізацыю: аптовая цана складае толькі 3,5 тысячы рублёў за кілаграм. Ідзе актыўны гандаль яблыкамі і на восеньскіх кірмашах.

### ВЫРАСЦІЦЬ, АЛЕ І ЗАХАВАЦЬ

Часіны, калі савецкія ІТРаўцы і студэнты перабіралі яблычныя кучы і адкідвалі гнілля, сыходзяць у мінулае. Новыя сховішчы — гэта вялізныя халадзільныя камеры, дзе створаны асаблівы мікраклімат. У іх павінен захавацца ўвесь вырашчаны ўраджай без страт, каб атрымаць за яго добрыя грошы ў сезон вітаміннага дэфіцыту.

— Мы маем сучасныя сховішчы для захоўвання ўраджаю яблык, — запэўніў Дзмітрый Ігнаценка. — У Магілёўскай вобласці ў сельскагаспадарчых арганізацыях узведзены 11 сховішчаў, якія дазваляюць умясціць амаль 10 тысяч тон прадукцыі. Плюс замежнае прадпрыемства «Арніка», якое паспяхова займаецца вытворчасцю яблыкаў і мае свае сховішчы на 11 тысяч тон. Усё гэта дазваляе нам захаваць прадукцыю, якая прызначана на зімняе спажыванне, у поўным аб'ёме.

Аднак з павелічэннем ураджаю ад прамысловых садоў неабходна павялічыць і колькасць сховішчаў. Іх будуюць, робіцца рэканструкцыя старых.

— Мы сёлета робім рэканструкцыю сховішчаў на 3,8 тысячы тон у 5 сельгаспрадпрыемствах, — працягвае Дзмітрый Ігнаценка. — Гэта «Радзіма» і «Новая Друць» Бялыніцкага раёна, «Вучгас БСХА» Горацкага раёна, «Лапічы» Асіповіцкага раёна і «Рассвет» Кіраўскага раёна.

Усё гэта буйныя і вядомыя гаспадаркі, дзе збіраюцца развіваць яшчэ і пладаводства. «Праблем з захаваннем яблыкаў у нас не будзе», — запэўніваюць у камітэце па сельскай гаспадарцы.

Між тым, рэзервы ў гэтай справе ёсць. Прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч на апошняй нарадзе Савета Міністраў крытыкаваў працу па нарыхтоўцы яблыкаў у краіне, звярнуўшы ўвагу на неабходнасць дадатковых захадаў па захоўванні ўсёй садавіны і гародніны, і ў прыватнасці, яблыкаў. Кіраўнік урада падкрэсліў, што трэба ў поўнай меры задзейнічаць усе сховішчы, актывізаваць іх будаўніцтва.

### ЯБЛЫЧНЫЯ КЛОПАТЫ

У насельніцтва Магілёўскай вобласці сёлета саспела ў садах, паводле падлікаў, больш за 70 тысяч тон яблыкаў. Людзі забяспечвалі імі сваякоў у горадзе, перараблялі ўраджай на варэнне і сцнулі на сокі, прадавалі. «Толькі каб не было страт» — такі дэвіз беларускага селяніна.

Спажывецкая кааперацыя актыўна набывала ўраджай і сёлета дацягнула амаль што да рэкорднай адзнакі.

— Нарыхтавана 24,5 тысячы тон яблыкаў, — паведаміў начальнік упраўлення па нарыхтоўках Магілёўскага аблспажыўсаюза Аляксандр Уткін. — І гэта пры тым, што самыя ўсходнія раёны вобласці сёлета не мелі вялікага ўраджаю.

Яблыкі летніх і ранніх восеньскіх гатункаў сабраныя ад насельніцтва і ў сельгаспрадпрыемствах, адпраўлены на перапрацоўку. Агульная лічба — 36 тысяч тон. Яны ідуць на выраб пладовага віна, сокаў і пюрэ з садавіны, джэмаў. Аднак самымі буйнымі спажыўцамі такіх яблыкаў з'яўляюцца вінныя заводы.

Спажывецкая кааперацыя, дарэчы, працягвае прымаць яблыкі ад насельніцтва. Аднак ужо не апад, а якасныя і непашкоджаныя плады, знятыя з галін дрэва.

— Кошт — 3-4 тысячы рублёў за кілаграм, у залежнасці ад гатунку і выгляду, — кажа Аляксандр Уткін. — Гэта ўжо не на перапрацоўку, а на продаж. Людзі здаюць, хоць, зразумела, цяпер аб'ёмы невялікія.

— Яблыкі сёння не гніюць, — запэўніў і Дзмітрый Ігнаценка. — Усё, што магло сапсавацца, даўно прададзена на рынках альбо з гэтага зрабілі сокі і віно. Прадукцыя з новых садоў нармальна захоўваецца. Таварыства «Александрыйскае» нават здае ў арэнду плошчы ў сваіх сховішчах, каб аблспажыўсаюз мог захоўваць сабраную прадукцыю. І пытанняў на гэты конт да нас не паступала.

**Ілона ІВАНОВА.**

## ■ Акцэнты тыдня з Вадзімам Гігіным

# ПАЧАТАК СУВЕРЭНІТЭТУ



**У нас.** Памятаеце, раней было прынята называць з'езды партыі «гістарычнымі». Гэта ўспрымалася з іроніяй. Але без усялякай іроніі і зусім абгрунтавана другі з'езд грамадскага аб'яднання «Белая Русь», што адбыўся 3 лістапада ў сталічным Палацы Рэспублікі, можна назваць гістарычным.

Праўда, «Белая Русь» вырашыла пакуль не ставіцца партыяй. І ў гэтым заключаецца менавіта гістарычнае (без усялякіх перабольшванняў) значэнне апошняга з'езда, які сабраў каля 400 дэлегатаў. Калі б члены аб'яднання вырашылі ўсё ж стаць партыяй, то, безумоўна, па сваім уплыве яна б набыла статус вядучай палітычнай сілы ў краіне. Цяпер у аб'яднанне ўваходзяць 132 тысячы чалавек з 7 208 пярвічных арганізацый. Гэта ў некалькі разоў больш, чым ва ўсіх дзеючых палітычных партыях краіны разам узятых. На мінулых парламенцкіх выбарах «Белая Русь» здолела правесці ў Палату прадстаўнікоў 63 сваіх прыхільнікаў, гэта значыць, больш за палову ад усяго дэпутацкага складу. Падчас тых жа выбараў «Белая Русь» накіравала 5 107 назіральнікаў — зноў жа больш, чым усе партыі і грамадскія аб'яднанні. Да гэтага можна дадаць, што многія члены арганізацыі — вядомыя і аўтарытэтныя людзі, а яе лідар Аляксандр Радзькоў займае пасаду першага намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

І ўсё ж новай партыі пакуль не будзе. Чаму? Прычын тут некалькі. Па-першае, наша заканадаўства не дае магчымасці аўтаматычна ператварыць грамадскае аб'яднанне ў партыю. Шлях стварэння пярвічак і рэгістрацыі прыйдзецца праходзіць па-новаму. Па-другое, гучыць шмат заяў, што будучая партыя стане цэнтрысцкай. Але што гэта азначае на практыцы? З ідэалогіяй у «Белай Русі» пакуль істотныя клопаты. Па-трэцяе, неабходнасць у такой партыі не зусім відавочная — пра гэта неаднойчы казаў і Прэзідэнт Беларусі. Ва ўсялякім разе вопыт дзеяння «партый улады» ў іншых краінах не заўжды станоўчы — дастаткова ўзгадаць імклівае падзенне рэйтынгу «Адзінай Расіі» і тыя палітычныя праблемы, якімі гэта падзенне суправаджалася.

Аднак, калі меркаваць па настроях дэлегатаў з'езда, яны, хутчэй, гатовы прыняць рашэнне аб стварэнні партыі. Трэба толькі трошкі пачакаць, дапрацаваць асобныя дэталі, як кажуць, «падцягнуць хвасты». Што ж, пажывём-пабачым.

**Вакол нас.** Калі амерыканцаў паставілі перад выбарам паміж мармонам і афраамерыканцам, большасць выбрала апошняга. Як і прадказвалі многія, Барак Абама быў пераабраны на новы прэзідэнцкі тэрмін.

У Злучаных Штатах вельмі дзіўныя выбары. Не будзе перабольшваннем сказаць, што гэта, хутчэй, імітацыя выбараў. Як гэта было неаднаразова раней, кандыдаты ад дзвюх вядучых партый спрачаюцца (трэба адзначыць, вельмі шчыра і з запалам) па пытаннях, якія можна аднесці, хутчэй, да разраду другога плана: лячыцца па абавязковай страхоўцы ці не, дазваляць аднаполыя шлюбы альбо пачакаць, легалізаваць аборты ці забараніць іх. Калі браць палітычныя і эканамічныя праграмы кандыдатаў, то яны амаль аднолькавыя, адрозніваюцца толькі ў рыторыцы і расстаноўцы акцэнтаў.

Рэальную апазіцыю да паўнавартаснага ўдзелу ў выбарах не дапусцілі. Рэспубліканцы і дэмакраты — гэта два крылы адной кіруючай партыі, якая моцна трымае ўладу ў Вашынгтоне і ва ўсіх штатах. Цікава назіраць, як некаторыя са здзіўленнем адкрываюць для сябе, што ў выбарах прымалі ўдзел і іншыя кандыдаты. А два з іх — Гэры Джонсан ад Лібертарыянскай партыі і Джыл Стайн ад «зялёных» — маглі нават мець шанц на поспех... Маглі, калі б іх дапусцілі да тэледэбатаў, калі б не арыштоўвалі некалькі разоў у час выбарчай кампаніі, калі б суды ўсур'ёз разглядалі іх скаргі. Такіх «калі» — некалькі дзясяткаў. Частка з іх знайшла адлюстраванне ў папярэдняй справаздачы назіральнай місіі АБСЕ. Аднак, нягледзячы на шматлікія парушэнні дзеючага заканадаўства, на архаічнасць самой выбарчай сістэмы ў Злучаных Штатах, пры якой грамадзяне «самай вялікай дэмакратыі» ў свеце не маюць магчымасць напрамую выбраць свайго прэзідэнта, выбары былі прызнаны місіяй АБСЕ законнымі і справядлівымі. Што тут скажаш? Застаецца прывесці толькі словы Мусаліні: «Сябрам — усё, ворагам — закон». Злучаныя Штаты не проста сябры кіраўніцтва АБСЕ — яны іх гаспадары.

З перамогай вас, спадар Абама!

**З гісторыі.** «Чырвоныя» ў горадзе! Менавіта такі покліч, які ў савецкіх фільмах выкрыкалі заўзятыя белагвардзейцы, прыходзіць у галаву, калі святкуецца 7 лістапада — Дзень Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Як і раней, ускладваюцца кветкі да помнікаў Леніна. Як і раней, збіраюцца групкі ветэранаў і віншуюць адзін аднаго. Зразумела, маштаб святкавання ўжо не той, і ўсё ж: Беларусь застаецца адзінай краінай на постсавецкай прасторы, у якой 7 лістапада — «чырвоны» дзень календара. Правільна гэта ці не, кожны павінен вырашаць для сябе асабіста, але пэўная гістарычная справядлівасць тут ёсць.

Без Кастрычніка 1917 года не было б сучаснай незалежнай і суверэннай Беларусі. Беларускі нацыянальны рух у пачатку XX стагоддзя быў слабы. Прыход да ўлады бальшавікоў стаў у літаральным сэнсе выратавальнай саломінкай для лідараў нацыянальных арганізацый. Бальшавікі былі зацятымі праціўнікамі рускага вялікадзяржаўнага шавінізму, які атаясамліваў з самаўладдзем, таму абвясцілі права на самавызначэнне для ўсіх народаў. Дарэчы, адной з першых атрымала незалежнасць Фінляндыя. 7 лістапада там не святкуюць на дзяржаўным узроўні, але памятныя шыльды і музей Леніна захоўваюць.

Ледзьве не на наступны дзень пасля стварэння савецкага ўрада Сталін, які стаў наркамам па справах нацыянальнасцяў, сустрэўся з прадстаўнікамі беларускага руху. Разам з тым, у Мінску існавала бальшавіцкая група Мяснікова-Кнорына-Ландара, якая выступала супраць самавызначэння беларускага народа. Аднак і гэтыя людзі пад невераготным ціскам з Масквы вымушаны былі ў канцы 1918 года пайсці на ўступкі і прыняць абвяшчэнне БССР. Без паслядоўнай пазіцыі Леніна і Сталіна на пабудову савецкай дзяржаўнасці ў Беларусі ніякая БНР, ніякія гурткі і арганізацыі не здолелі б прывесці да стварэння суверэннай беларускай дзяржавы. Яны папросту не мелі такіх уладных рэсурсаў і магчымасцяў.

Сапраўды, Савецкая ўлада — гэта харчовая дыктатура і «чырвоны тэрор», жудасная калектывізацыя і антырэлігійныя ганенні. Аднак, калі мы вызнаем у якасці каштоўнасці нацыянальную дзяржаўнасць, то нельга не прызнаць значныя заслугі той палітычнай сілы, што прыйшла да ўлады 95 гадоў таму.

*zviazda.by*
*gigin@belta.by* ■

## ЕЎРАКАМІСІЯ ПАНІЗІЛА ПРАГНОЗ РАЗВІЦЦЯ

Ацэнка дынамікі ВУП паніжана на наступны год для еўразоны, ЕС і, у прыватнасці, наймагутнейшай эканомікі рэгіёна — Германіі. Чацвёрка найбуйнейшых краін еўразоны стала выглядаць горш з пункту гледжання прагнозу росту эканомікі. Прагнозы дынамікі беспрацоўя таксама несуцяшальныя. У прыватнасці, Еўракамісія панізіла ацэнку росту ВУП еўразоны на 2013 год да 0,1% з 1%, ЕС — да 0,4% з 1,3%, Германіі — да 0,8% з 1,7%, Францыі — да 0,4% з 1,3%, Італіі — да падзення ў 0,5% з росту ў 0,4%, Іспаніі — да скарачэння на 1,4% супраць 0,3%.


**ООО «Инсталл-Билдинг»**
**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**
**по продаже имущества, принадлежащего ООО «Инсталл-Билдинг»**

| № лота | Наименование имущества | Начальная цена лота, без НДС, руб. | Задаток 10%, без НДС, руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| 1 | Экскаватор Варинский (гусеничный) К 606, 1988 г.в., двигатель дизель | 14 720 000 | 1 472 000 |
| 2 | Газ 52-1. Год выпуска – 1992 (Микроавтобус) | 4 402 400 | 440 240 |

Организатор торгов: управляющий в деле о банкротстве ООО «Диспонент»: г. Гомель, ул. Молодости, 5, тел. моб. (8029) 621 22 36.

Продавец: ООО «Инсталл-Билдинг», г. Гомель, ул. 5-я Техническая, 1а.

Задаток перечисляется до 26.11.2012 г. (включительно), на р/с 3012401232013 в ОАО "Приорбанк" г. Минск ЦБУ № 400, МФО 749, УНП 490421723.

Условия продажи – без условий.

Шаг аукциона в размере 10% от начальной цены.

После окончания торгов с победителем подписывается протокол и в течение 20 дней заключается договор. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 30 дней после подписания протокола. Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки.

В случае признания торгов несостоявшимися, в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником, возможна продажа лота этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%.

Затраты на организацию и проведение торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам торгов документации, необходимой для их проведения, возмещаются победителем торгов.

Для участия в аукционе необходимо подать письменное заявление установленной формы (подробности по тел.) с приложением: копии платежного поручения о внесении суммы задатка, для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей – заверенная копия свидетельства о гос. регистрации; для физ. лиц – копия паспорта либо иного документа, удостоверяющего личность.

Срок подачи заявления: с момента выхода настоящего объявления **до 16.00 26.11.2012 года** по адресу: г. Гомель, ул. Молодости, 5.

Дата, время, место проведения открытого аукциона: **27.11.2012 года в 12.00**, г. Гомель, ул. Молодости, 5.

**По вопросам участия в аукционе и приобретения имущества должника обращаться по телефонам: (8 029) 621 22 36 или тел./факс 8 0232 68 25 50.**

**Дополнительная информация: www.disponent.by**


## ■ Беларусь і свет

# БАНГЛАДЭШ: ПЕРСПЕКТЫВЫ СУПРАЦОЎНІЦТВА



**Бангладэш з'яўляецца перспектыўным партнёрам для Беларусі. У 2011 годзе нашы краіны змаглі павялічыць тавараабарот у 2,5 раза ў параўнанні з 2010 годам, давёўшы яго амаль да 140 мільёнаў долараў. Улічваючы, што насельніцтва Бангладэш перавышае 160 мільёнаў чалавек (хоць такая лічба і аспрэчваецца), гэтая краіна можа з часам закупляць большую колькасць беларускіх тавараў, чым цяпер.**

Галоўным стрымальным фактарам на шляху беларускага экспарту з'яўляецца нізкая плацежаздольнасць насельніцтва. Валавы ўнутраны прадукт на душу ў Бангладэш амаль у восем разоў ніжэй, чым у Беларусі, што дазваляе грамадзянам купляць у асноўным толькі вельмі танныя тавары. У выніку імпарт тавараў з еўрапейскіх краін з высокім коштам працоўнай сілы мінімальны, асноўнымі экспарцёрамі тавараў у Бангладэш з'яўляюцца краіны з нізкім коштам працоўнай сілы — Кітай і Індыя. У выніку ўсё яшчэ вельмі дрэнна развіты знешні гандаль — тавараабарот Бангладэш ніжэй за беларускі прыкладна ў паўтара раза, пры тым, што насельніцтва ў гэтай краіне больш амаль у 17 разоў.

У эканоміцы Бангладэш дамінуе аграрны сектар з нізкай дабаўленай вартасцю. У той жа час краіна ў апошнія паўтара дзесяцігоддзя змагла дабіцца дастаткова высокіх тэмпаў развіцця эканомікі, што дазваляе разлічваць на сур'ёзныя перспектывы ў развіцці як сельскай гаспадаркі, так і прамысловасці. Менавіта тут Беларусь можа прапанаваць свае паслугі, улічваючы ў тым ліку паспяховы вопыт стварэння зборачных вытворчасцяў у Венесуэле.

У час майскага візіту міністра замежных спраў Народнай Рэспублікі Бангладэш Дзіпу Моні ў 2012 годзе прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч заявіў пра гатоўнасць беларускага боку пабудаваць у Бангладэш некалькі заводаў па выпуску сельгастэхнікі. Танная і якасная беларуская тэхніка дапаможа мадэрнізаваць сельскую гаспадарку краіны, зрабіўшы яе больш сучаснай і павысіўшы рэнтабельнасць. Гэта асабліва актуальна для Бангладэш, улічваючы, што вялізнае насельніцтва краіны вымушана развівацца на тэрыторыі меншай, чым тэрыторыя Рэспублікі Беларусь, і сельская гаспадарка павінна быць вельмі сучаснай, каб скараціць імпарт прадуктаў.

Такога кшталту праекты могуць быць паспяхова рэалізаваны, улічваючы, што на тэрыторыі краіны ёсць свабодныя эканамічныя зоны з вельмі выгаднымі ўмовамі для замежных інвестараў. Акрамя гэтага, падобнае будаўніцтва можа садзейнічаць не толькі росту прамысловага патэнцыялу краіны, але і экспарту, паколькі Бангладэш мае льготныя ўмовы для доступу сваіх тавараў на асноўныя сусветныя рынкі. Беларуская прапанова з'яўляецца сучаснай, паколькі ў апошнія гады падобная цікавасць па развіцці прамысловых прадпрыемстваў на тэрыторыі Бангладэш выказана з боку Кітая, Індыі і шэрагу вядучых ісламскіх эканомік. Кітайскія прадпрымальнікі на фоне росту зарплат у КНР прыходзяць у Бангладэш у пошуках таннай працоўнай сілы з вялікім энтузіязмам, і прыток кітайскіх інвестыцый з'яўляецца добрай падмогай для развіцця краіны і пазітыўным сігналам для іншых інвестараў.

Цікавасць да супрацоўніцтва з'яўляецца ўзаемнай. У час беларуска-бангладэшскага бізнэс-форуму, які адбудзецца 11—13 лістапада 2012 года ў Бангладэш, плануецца стварэнне Савета дзелавога супрацоўніцтва «Беларусь — Бангладэш». Падобная структура неабходная для развіцця супрацоўніцтва дзвюх эканомік на пастаяннай аснове. Тое, што патэнцыял для супрацоўніцтва маецца вялікі, пацвярджае і склад беларускай дэлегацыі, у які ўваходзяць прадстаўнікі найбуйнейшых беларускіх прадпрыемстваў. Прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч, які ўзначальвае дэлегацыю, сустрэнецца з прэзідэнтам і прэм'ер-міністрам Бангладэш, а таксама з ключавымі міністрамі ў эканамічнай сферы. Умовы для супрацоўніцтва палепшацца ў выніку падпісання пагаднення паміж урадам Рэспублікі Беларусь і ўрадам Народнай Рэспублікі Бангладэш аб садзейнічанні ажыццяўленню і ўзаемнай абароне інвестыцый.

Някепскія перспектывы складаюцца і ў ваенна-тэхнічным супрацоўніцтве. Яго развіццё звязваецца са спецыяльным пагадненнем паміж Рэспублікай Беларусь і Народнай Рэспублікай Бангладэш, якое дазволіць не толькі палепшыць умовы для гандлю, але і кааперавацца для працы на рынку трэціх краін.

Надае аптымізму і знешнепалітычнае супрацоўніцтва.

Беларусь і Бангладэш супрацоўнічаюць у рамках «Руху недалучэння». Бангладэш таксама стала членам «Групы сяброў» створанай па ініцыятыве Беларусі ў лютым 2010 года для барацьбы з гандлем людзьмі. У кастрычніку 2011 года Бангладэш выступіла суаўтарам беларускай рэзалюцыі «Забарона распрацоўкі і вытворчасці новых відаў зброі масавага знішчэння і новых сістэм такой зброі: даклад Канферэнцыі па раззбраенні», прадстаўленай пазней для разгляду Генеральнай Асамблеі ААН. Выходзячы з ранейшага пазітыўнага вопыту супрацоўніцтва, у маі 2012 года Прэзідэнт Беларусі прапанаваў палітычнаму кіраўніцтву Бангладэш развіваць стасункі стратэгічнага партнёрства.

**Сяргей КІЗІМА,**
**загадчык кафедры міжнародных адносін Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, доктар палітычных навук** ■

# НА БЕЛЫМ ХУТКА «ЧЫРВАНАКНІЖНІК» СВІСНЕ!


Вось які ён — шыракапалы вусач!


Менеджар праекта Уладзімір КАЛТУНОЎ і спецыяліст па сувязях з грамадскасцю Ірына НОВАК будуць устанаўліваць стэнд з інфармацыяй прыродаахоўнага зместу на возеры Белым.


Начальнік міжрайінспекцыі Аляксей ПРОТАС і сямікласнік Зябкаўскай школы Аляксей АЛЕКСІЁНАК разглядаюць рака-перасяленца

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Нават старшыня райвыканкама Алег Мархат на некалькі гадзін адклаў усе важныя справы і прыехаў на бераг Белага возера. Кіраўнік раёна лічыць, што Глыбоччыне выпалі адначасова і адказная, і ганаровая місіі. Дасць Бог, з гэтых азёр пойдзе аднаўленне папуляцыі рака ў Беларусі. Хіба не падстава для гонару? А тыя, хто будзе наведвацца сюды адпачыць, уважліва пазнаёмяцца з інфармацыяй на ўсталяваных спецыяльных стэндах і далучацца да тых, хто пакідае пасля сябе чысціню і парадак, як гэта робіцца ва ўсім цывілізаваным свеце.

Адзін з удзельнікаў акцыі на Белым і Млічыне, бадай, лепшы знаўца тутэйшых прыродных багаццяў — начальнік глыбоцкай міжраённай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету Аляксей Протас заўважыў, што, нягледзячы на аддаленасць возера ад райцэнтра (а гэта добрая паўсотня кіламетраў), яно заўсёды ў полі зроку інспекцыі. Аляксей Віктаравіч запэўніў, што цяпер рэйды будуць адбывацца штодня. Бо ахвотных пераступіць межы закона, на жаль, яшчэ хапае.

Цікава і крыху нечаканa атрымалася: начальнік інспекцыі і хлопчык, з якім разам выпускалі першых ракаў, аказаліся цёзкамі (і першы, і другі — Аляксей). Своеасаблівая эстафета пераемнасці пакаленняў.

**Анатоль КЛЯШЧУК.**
**Фота аўтара.**

## ■ Мост дружбы

# КОЛАСАЎСКАЯ ВОСЕНЬ У КІТАЙСКІМ ВЫКАНАННІ

**У Літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа падведзены вынікі конкурсу перакладаў паэзіі і прозы Янкі Купалы і Якуба Коласа.**


Мэй Ханьчэн і сын Якуба Коласа — Міхась Міцкевіч.

Арганізатары творчага спаборніцтва — Рэспубліканскі інстытут кітаязнаўства імя Канфуцыя БДУ і Інстытут Канфуцыя ў МДЛУ. Журы ўзначаліў першы сакратар па пытаннях адукацыі і культуры пасольства КНР у Рэспубліцы Беларусь Мэй Ханьчэн. Дастаткова шырокай была палітра абраных для перакладу твораў. Пераможцам у намінацыі «Паэзія» сталі студэнты лінгвістычнага ўніверсітэта Крысціна Гоцава і Яо Юань за пераклад верша Якуба Коласа «Лес».


Фотаздымкі Марыны БЕГУНКОВАЙ.
Узнагароды пераможцам уручае дырэктар Рэспубліканскага інстытута кітаязнаўства імя Канфуцыя БДУ Аляксандр Гарадзей.

Другое месца — таксама ў студэнтаў МДЛУ Валерыі Наврось і Інь Сяашань, якія пераўвасобілі на мову Канфуцыя верш Янкі Купалы «Пакахай мяне, дзяўчынка». Прызёрам стала і студэнтка-міжнародніца БДУ Вольга Кулай. Журы адзначыла яе пераклад верша Янкі Купалы «Мая вера». Сярод перакладчыкаў празаічных тэкстаў лепшымі аказаліся студэнты МДЛУ Крысціна Марачкіна і Лю Чжэаюань (за ўрывак з трылогіі Якуба Коласа «На ростанях»), Яна Радзілавец і Лі Мэнцзяа (іх таксама прывабіла палеская трылогія народнага песняра), Дар'я Супрановіч і Лі Цісюань, якія пераклалі алегарычную казку Якуба Коласа «Зло — не заўсёды зло».

Вечарына ў Коласаўскім музеі, якую ўпрыгожылі выступленні кітайскіх і беларускіх студэнтаў Акадэміі музыкі, Беларускага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, запомніца таксама музычнымі адкрыццямі таленавітай моладзі. Відаць, сярод іншых набыткаў з Беларусі спявак Вэй Янань і піяніст Вэй Цзін павязуць на радзіму лірыка-драматычны твор «Восень», асновай якога сталі радкі з неўміручай «Новай зямлі». І музыка да гэтай пранікнёнай беларускай песні напісана кітайскім кампазітарам.

А галоўны рэдактар часопіса «Полымя» Мікола Мятліцкі чытаў на вечарыне свае пераклады з кітайскай паэзіі — Ай Ціна і іншых класікаў прыгожага пісьменства з Паднябеснай. Дзякуючы падтрымцы Рэспубліканскага інстытута кітаязнаўства імя Канфуцыя Белдзяржуніверсітэта беларускі творца падрыхтаваў да выдання анталогію «Сто паэтаў Кітая». І яго праца, і здабыткі маладых перакладчыкаў — новая прастора беларуска-кітайскіх літаратурных стасункаў. Пра гэта гаварылі на сустрэчы ў доме Коласа і дырэктар музея Зінаіда Камароўская, і сын народнага песняра — Міхась Канстанцінавіч Міцкевіч.

**Кастусь ЛАДУЦЬКА**

## НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

### ВЫЙШАЎ НА ТОНКІ ЛЁД? ЗАПЛАЦІШ ШТРАФ

Міністэрства па надзвычайных сітуацыях прапануе ўвесці адказнасць за выхад на лёд у перыяд лёдаўтварэння, ускрыцця рэк і вадаёмаў. Увядзенне штрафаў — да 10 базавых велічынь (да 1 мільёна рублёў) для першага падобнага парушэння — разам з узмацненнем растлумачальнай работы дазволіць папярэдзіць мноства трагедый, лічаць тут.

У дзейных «Правілах аховы жыцця людзей на водах Рэспублікі Беларусь» дакладна гаворыцца, што «выхад на лёд забараняецца падчас ледаставу, пакуль таўшчыня лёду не дасягне 7 сантыметраў, а таксама ў перыяд інтэнсіўнага раставання і разбурэння лёду». Аднак ці выконваецца гэтае патрабаванне на вадаёмах позняй восенню ці ўвесну? Міністэрства па надзвычайных сітуацыях канстатуе, што цяпер адказнасці за падобнае парушэнне няма. А тонкі лёд кожны год не вытрымлівае цяжару дзясяткаў безадказных грамадзян. Некага з іх атрымліваецца выратаваць, кагосьці, на жаль, не — іх целы дастаюць з вады спецыялісты АСВОДа і МНС. Прапануецца, што рашэнне аб забароне (спыненні забароны) выхаду на лёд будуць прымаць мясцовыя органы ўлады з улікам кліматычных умоў (інфармацыя пра таўшчыню лёду аператыўна размяшчаецца на сайце Рэспубліканскага гідраметэацэнтра). У гэтай сувязі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях прапанавала аблвыканкамам і Мінгарвыканкаму, рэспубліканскім органам дзяржупраўлення выказацца па гэтай праблеме. На інтэрнэт-сайце міністэрства сваё меркаванне могуць выказаць і грамадзяне.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### У МІНСКІМ МЕТРО З'ЯВІЎСЯ НЕВЯДОМЫ ДУШЫЦЕЛЬ

Невядомы сярод белага дня ледзь не задушыў дзяўчыну ў пераходзе мінскага метро, паведамілі БЕЛТА ў РУУС Фрунзенскага раёна сталіцы. Інцыдэнт адбыўся 31 кастрычніка каля 15.00 у падземным пераходзе станцыі метро «Маладзёжная». Невядомы ззаду накінуў на шыю дзяўчыны шалік і стаў яе душыць, пасля чаго з месца здарэння ўцёк. Дзеянні невядомага зафіксавалі камеры назірання ў пераходзе. Міліцыя разлічвае на тое, што здымкі дапамогуць апазнаць нападаўшага. Усе, хто валодае інфармацыяй аб анкетных звестках або месцазнаходжанні злачынцы, могуць паведаміць у міліцыю па тэлефоне (017) 252 02 02 або 102. Канфідэнцыяльнасць і ўзнагароджанне гарантуюцца.



**Кар. БЕЛТА.**

### 139 ТЫС. 889 ВАДЗІЦЕЛЯЎ

падрыхтавана за 9 месяцаў 2012 года ў навучальных арганізацыях рэспублікі. Гэта на 4,3% больш, чым за аналагічны перыяд 2011 года. Як паведамілі ў прэс-цэнтры Міністэрства транспарту і камунікацый, з агульнай колькасці падрыхтаваных 99 тыс. 626 чалавек (або 71,2%) складаюць вадзіцелі МТС катэгорыі «В» (легкавы аўтамабіль). Рост колькасці тых, хто прайшоў навучанне ў аўташколах, адзначаецца ў Брэсцкай вобласці (на 17,8%), Гродзенскай (на 10,5%), Мінскай (на 6,9%), Віцебскай (на 7%), Магілёўскай (на 5,8%), зніжэнне — у Мінску (на 6,8%) і Гомельскай вобласці (на 5,3%). На стане на 1 кастрычніка падрыхтоўку, перападрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі вадзіцеляў механічных транспартных сродкаў ажыццяўлялі 513 навучальных арганізацый. У параўнанні з аналагічным перыядам 2011 года іх колькасць павялічылася на 12, або на 2,4%.

**Андрэй ПЯТРОЎ, «Мінск—Навіны».**

### 1,5 КГ РТУЦІ Ў ЖЫЛЛІ

У Брэсце жанчына ў сваёй кватэры знайшла паўтара кілаграма ртуці. Увечары ў службу МНС паведамілі, што пры вынасе старой мэблі з жылля, размешчанага па праспекце Машэрава, у куце пакоя была знойдзена шкляная ёмістасць на 200 мл з рэчывам, падобным на ртуць... Выкліканыя работнікі МНС сапраўды забралі з кватэры ртуць вагой каля 1,58 кг і змясцілі яе на склад для далейшай утылізацыі. Забруджвання навакольнага асяроддзя і пацярпелых не было.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ВОСЕНЬСКІЯ АДКРЫЦЦІ

**На гэтым тыдні ў сельскіх раёнах Магілёўскай вобласці адкрыліся новыя аб'екты, сацыяльныя і вытворчыя**

Новая лінія з'явілася на хлебазаводзе ў Быхаве, адкрылася крама ў Клічаве. У Круглянскім раёне завяршылі будаўніцтва некалькіх ферм, дзе на ўзбраенні сучасныя тэхналогіі, — а ў Клімавіцкім раёне здалі новы цэх у свінакомплексе «Сосны».

У Чэрыкаве адкрыўся дзіцячы дом сямейнага тыпу. Яго гаспадыня — Ірына Сцепаненка, якая выхоўвае 6 дзяцей, з іх 4 — дзеці-сіроты. У Магілёўскай вобласці гэты сямейны дзіцячы дом — 39-ты па ліку. Увогуле ў іх жывуць 258 дзяцей. Сёлета ў рэгіёне павінна стаць 40 такіх дамоў, калі яшчэ адзін дзіцячы дом сямейнага тыпу адкрыецца ў Круглым.

**Ілона ІВАНОВА**

Віншуем з 70-годдзем любую жонку і матулю, дарагую бабулю і проста цудоўнага чалавека **Праскоўю Мікалаеўну ЗДАНОВІЧ** з вёскі Кунцавічы Баранавіцкага раёна Брэсцкай вобласці. Жадаем юбілярцы моцнага здароўя, жыццёвага шчасця, сямейнага дабрабыту.

*Муж, дзеці, унукі.*

# ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

10 ЛІСТАПАДА 2012 г.
СУБОТА
№ 21 (15707)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года



Фота з уласнага архіва зоркі.

Саша ПАЎЛАВА:

# «Я НЕ ЖАНЧЫНА З ВОКЛАДКІ»

**ЧАСАМ здараецца так, што перад знаёмствам з цікавым чалавекам, пра якога раней толькі нешта чуў ці бачыў яго на экране, задумваешся: а ці не расчаруешся ты ў ім пасля асабістай сустрэчы? Так было і са мной, калі збіралася на інтэрв'ю да Сашы Паўлавай. У маім уяўленні склаўся вобраз недасяжнай і распешчанай увагай «зоркі», а ў рэальнасці я ўбачыла жанчыну, якая скарае вяршыню за вяршыняй, але не збіраецца спыняцца на дасягнутым. У гэтым ёй дапамагае каласальная працаздольнасць і, у немалой ступені, шанцаванне. Магчыма, аснова поспеху Сашы Паўлавай у тым, што яна заўсёды рабіла толькі тое, што прыносіла ёй задавальненне, і не забывалася, што папулярнасць — рэч зменлівая: сёння яна ёсць, а заўтра — хто ведае...**

**— Быў час, калі вы з'язджалі з Беларусі, каб здзейсніць свае мары, потым вярталіся. Цяпер зноў у пошуку?**

— У снежні мінулага года я сышла з тэлеканала АНТ і вырашыла падарыць сабе год адпачынку, каб паглядзець як мага больш новых краін, людзей. Каб сустрэцца з сябрамі ў Галандыі, з якімі даўно не бачылася. Таму зараз усё, чым я займаюся, — гэта падарожнічаю з сям'ёй, з маладым чалавекам і самастойна.

**— Дзе пабывалі?**

— Аб'ехалі ўсю Еўропу. Два разы былі ў Тайландзе. Там займаліся тайскім боксам. Цяпер збіраемся на Філіпіны, каб сустрэць канец свету святочна! *(Смяецца)*.

**— Верыце, што ён усё ж такі будзе?**

— Веру. Я наогул веру ўсяму, што інтэрнэт піша. Ён жа не хлусіць. *(Смяецца)*.

**— Якія падарожжы пакінулі самыя яркія ўражанні?**

— Гэта Тайланд. Там вельмі цікавыя людзі. Заўсёды ўсміхаюцца і ківаюць галавой. Яны нават калі не разумеюць англійскай мовы, усё роўна табе ўсміхаюцца. Падабаюцца іх клімат, кухня. Пасля паездак у Тайланд у маёй дамскай сумачцы можна знайсці соус табаска. Ён не ўсюды ёсць, а мне падабаецца дадаваць яго ў стравы. Падабаецца тайскі бокс... Усё ў гэтай краіне мне па душы... Ну, акрамя цэн на білеты.

**— А тайскім боксам даўно займаецеся?**

— Пачала шмат гадоў таму, калі жыла ў Галандыі. Але паколькі мая сіла волі ўключаецца толькі ў пэўныя моманты, то зразумела, што сур'ёзна гэты намер змагу здзейсніць толькі ў Тайландзе. Бо там рэжым трэніровак, харчавання — усё па раскладзе.

**— Калі вы вярнуліся ў Беларусь і пачалі прабівацца на канал АНТ, ці паспрыяў вам вопыт працы на галандскім тэлебачанні?**

— Вопыт — рэч заўсёды карысная. Асабліва гэта датычылася прамых эфіраў. Я не баялася, што, калі нешта пойдзе не так, другога дубля ўжо не будзе.

**(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)**

# СТУДЭНЦКАЯ СТЫПЕНДЫЯ:
## каму, за што і ў якім памеры?

**У прафсаюзе канстатуюць: ахоп стыпендыяльным забеспячэннем пачаў змяншацца**

**Па звестках Белстата, на пачатак 2011/2012 навучальнага года стыпендыю атрымліваў кожны другі студэнт дзённай бюджэтнай формы навучання. Але пасля ўвядзення новых крытэрыяў для атрымання стыпендыі ахоп стыпендыяльным забеспячэннем стаў пакрысе змяншацца. А па некаторых установах адукацыі назіраецца нават даволі істотнае зніжэнне.**

**(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)**

**У Беларусі пытанні стыпендыяльнага забеспячэння сёння рэгулююцца трыма дакументамі: Кодэксам аб адукацыі, Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 398 ад 6 верасня 2011 года «Аб сацыяльнай падтрымцы навучэнцаў» і «Інструкцыяй аб умовах, парадку прызначэння і выплаты стыпендыі і іншых грашовых выплат навучэнцам», зацверджанай сумеснай пастановай міністэрстваў адукацыі і фінансаў № 398 ад 22 верасня 2011 года.**


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Дарогу маладым

## АД ДЭБАТАЎ ГУЛЬНЯВЫХ — ДА ДЭБАТАЎ САПРАЎДНЫХ

**ВА ўсіх абласцях Беларусі неўзабаве будуць створаны моладзевыя палаты. Аб гэтым абвясціў старшыня Моладзевай палаты пры Мінскім гарадскім Савеце дэпутатаў Уладзімір Кавалёў на сустрэчы ўдзельнікаў II Дыпламатычнай школы. Апошняя праходзіць з шостага па адзінаццатага лістапада ў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, з дэпутатамі Нацыянальнага сходу. У ёй удзельнічаюць маладыя парламентарыі і грамадскія дзеячы як з Беларусі, так і з астатніх краін СНД. Мерапрыемствы школы адбываюцца ў рамках III Міжнароднай моладзевай навукова-практычнай канферэнцыі «Навуковыя імкненні-2012».**

— Другая Дыпламатычная школа праводзіцца Цэнтрам студэнцкіх навуковых ініцыятыў Савета маладых вучоных Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Сёлета ў ёй удзельнічае трыццаць адзін чалавек. Пераважная большасць — беларусы. Але ёсць пяцёра гасцей з іншых краін: Расіі, Украіны і Кыргызстана. Сярод іх — і школьнікі, і студэнты, і выкладчыкі, і маладыя вучоныя. Між іншым, да нас падыходзілі і ўдзельнікі іншых секцый навуковай канферэнцыі — эканомікі, паліталогіі, культуралогіі... Яны цікавіліся, як можна да нас патрапіць. На жаль, мы былі вымушаны часткова ім адмовіць, — распавядае **адзін з каардынатараў праекта Аляксандр КЛІМАШЫН.** — Справа ў тым, што рэгламент сустрэчы з палітычнымі і культурнымі дзеячамі прадугледжвае строгі спісачны састаў. Напрыклад, гэта датычыцца візіту ў Нацыянальны сход. Аднак кожны ахвотны можа прыняць удзел у таварыскай турнірнай гульні «Парламенцкія дэбаты».

Дарэчы, некаторыя ўдзельнікі II Дыпламатычнай школы, магчыма, хутка здолеюць дэбатаваць па-сапраўднаму. Бо ў перспектыве з'явіцца агульнарэспубліканскі моладзевы парламент, які будзе мець права дарадчага голасу. **Намеснік старшыні Цэнтра студэнцкіх навуковых ініцыятыў пры Савеце маладых вучоных Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Анастасія ГВАРДЫЯН** лічыць, што моладзі трэба даваць голас у палітыцы:

— Аб тым, што ў Беларусі патрэбны моладзевы парламент, казалі і старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір Андрэйчанка, і старшыня Савета маладых вучоных НАН Беларусі Уладзімір Казбанаў. Пяць гадоў таму пры Мінскім гарадскім савеце была створана Моладзевая палата. За гэты час назапашаны багаты вопыт узаемадзеяння маладых і больш вопытных палітыкаў. Але ўжо трэба пераходзіць на новы, вышэйшы ўзровень. Трэба, каб да інтарэсаў маладых людзей больш прыслухоўваліся, бо за імі будучыня.

— Хоць фактычна Моладзевая палата мае права дарадчага голасу, але гэта выдатны шанц выказаць свой пункт погляду, каб яго пачулі, — лічыць прадстаўнік Кыргызстана Бектур Ібрагімаў.

Сярод іншага, удзельнікі Дыпламатычнай школы праслухалі лекцыі, прысвечаныя тэмам моладзевай палітыкі, парламенцкай дзейнасці, супрацоўніцтву краін СНД. А сёння яны здаюць залік, дзе і прадэманструюць атрыманыя веды.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
10 11 2012 г.

# СТУДЭНЦКАЯ СТЫПЕНДЫЯ...

**(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**

— Планка патрабаванняў пры прызначэнні стыпендый узнялася, што не магло не адбіцца на колькасці іх атрымальнікаў, — патлумачыў сітуацыю **намеснік старшыні ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Раман ДАПІРА.** — Скажам, у інструкцыі прадугледжана прызначэнне вучэбных стыпендый студэнтам гуманітарных спецыяльнасцяў, будучым эканамістам, сацыяльным работнікам, педагогам, дызайнерам пры ўмове наяўнасці ў іх сярэдняга бала паспяховасці не менш як 6,0. Раней неабходнай умовай быў мінімальны сярэдні бал 5,5. Для навучэнцаў прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў абавязковай умовай прызначэння вучэбнай стыпендыі з'яўляецца цяпер наяўнасць сярэдняга бала як мінімум 4,0. Раней было 3,0. Імкненне матываваць навучэнцаў да паспяховай вучобы цалкам зразумелае. Але ўся бяда ў тым, што ў розных ВНУ і на розных профілях навучання ў выкладчыкаў можа быць крыху рознае разуменне таго, за што студэнтам трэба выстаўляць 5, 6 або 7 балаў. А ў выніку церпяць студэнты.

## Сацыяльная стыпендыя як крайняя мера

Акрамя вучэбных, існуюць таксама сацыяльныя, спецыяльныя стыпендыі, якія прызначаюцца пры адпаведных сацыяльных абставінах, а таксама стыпендыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, імянныя і персанальныя стыпендыі. Прызначэнне імянных, прэзідэнцкіх і персанальных стыпендый заключаецца ў стымуляванні і заахвочванні самых яркіх студэнтаў за іх асаблівыя поспехі ў вучобе, навукова-даследчай, грамадскай і творчай дзейнасці. Таму і колькасць іх абмежаваная. Напрыклад, прэзідэнцкія стыпендыі могуць атрымліваць усяго 200 студэнтаў і курсантаў і 100 аспірантаў, але гэта сапраўды лепшыя навучэнцы.

Між іншым, галіновы прафсаюз таксама заснаваў свае выплаты для навучэнцаў, якія ўстанаўліваюцца штогадова напярэдадні Міжнароднага дня студэнтаў. Пэўны час было складана знайсці патрэбную колькасць прэтэндэнтаў, якія б адпавядалі ўсім патрабаванням (на працягу ўсяго навучання мелі ў залікоўках толькі выдатныя адзнакі, асаблівыя поспехі ў навукова-даследчай і творчай дзейнасці, а таксама, зразумела, мелі дасягненні ў прафсаюзнай працы і грамадскай дзейнасці). Але зараз гэта цалкам рэальна. Больш за тое, вядучым установам вышэйшай адукацыі ўжо неадназорова прадстаўлялі адразу некалькі кандыдатур на выплаты. Гэта значыць, што сярод прафсаюзнага актыву навучэнцаў дастаткова тых, хто здольны спалучаць, здаецца, неспалучальнае: паўсюдна паспяваць і ўсё рабіць на самым высокім узроўні.

**— Шчыра кажучы, самым хваравітым пытаннем для нас з'яўляецца сёння прызначэнне сацыяльных стыпендый,** — прызнаецца Раман Дапіра, — паколькі гэты від стыпендыі з'яўляецца формай сацыяльнай падтрымкі тых студэнтаў і навучэнцаў, паспяховасць якіх не пакідае ім шанцаў прэтэндаваць на прызначэнне вучэбнай стыпендыі, але ў якіх няма акадэмічнай запазычанасці ці яна ліквідавана ў адпаведны тэрмін. Установа адукацыі разам з прафсаюзнай арганізацыяй павінны весці сумесны ўлік асобных катэгорый навучэнцаў, якім можа прызначацца сацыяльная стыпендыя. А гэта дзеці-сіроты, дзеці, якія засталіся без бацькоўскай апекі, асобы, якія страцілі апошняга з бацькоў у час атрымання адукацыі, інваліды, так званыя «чарнобыльцы», цяжарныя жанчыны і некаторыя іншыя катэгорыі.

Дарэчы, рэгулярнасць прызначэння сацыяльных стыпендый па гэтых пакажчыках не абмежаваная, наяўнасць адпаведнай заявы навучэнца не абавязковая, бо свой статус ён перыядычна пацвярджае праз прадастаўленне неабходных дакументаў. Такім чынам, гэтыя катэгорыі навучэнцаў абаронены ў пытаннях стыпендыяльнага забеспячэння. Тое ж датычыцца катэгорый, што маюць права на прызначэнне сацыяльнай стыпендыі. Праўда, калі памер вучэбнай стыпендыі, якая можа быць прызначана навучэнцу па выніках атэстацыі, большы за памер спецыяльнай стыпендыі, на якую ён мае права ў адпаведнасці з заканадаўствам, тады яму прызначаецца вучэбная стыпендыя — гэта значыць, прызначаецца стыпендыя, памер якой большы.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Трэба мець на ўвазе, што на сацыяльную стыпендыю таксама могуць прэтэндаваць паспяваючыя навучэнцы, якія знаходзяцца ў цяжкім матэрыяльным становішчы. **Галоўная праблема заключаецца ў тым, што многія кіраўнікі факультэтаў, аддзяленняў і г.д. не ведаюць, што трэба разумець пад «цяжкім матэрыяльным становішчам». Гэтае паняцце ні ў якіх дакументах не вызначана. А значыць, што ва ўстановах адукацыі могуць яго трактаваць па-свойму?** Насамрэч многія кіраўнікі проста не жадаюць браць на сябе адказнасць па аднясенні студэнтаў або навучэнцаў да катэгорыі тых, хто знаходзіцца ў цяжкім матэрыяльным становішчы.

— Ёсць меркаванне, што падтрымка студэнтаў — гэта галаўны боль іх бацькоў: маўляў, навошта перакладваць гэты клопат на плечы ўстановы адукацыі? Але я лічу, што фінансава падтрымліваць сваіх дзяцей — права, а не абавязак бацькоў. Калі ў іх ёсць такая магчымасць, яны абавязкова падтрымаюць сваё дзіця. А што рабіць, калі такой магчымасці няма? — дзеліцца сваім бачаннем сітуацыі Раман Дапіра. — Ды ўвогуле, як можна прапісаць у дакументах кожны індывідуальны выпадак ці жыццёвую сітуацыю, у якія можа трапіць малады чалавек? Таму, калі ёсць хадайніцтва студэнцкага прафсаюза і пярвічнай арганізацыі БРСМ аб прызначэнні таму ці іншаму студэнту сацыяльнай стыпендыі, кіраўнік установы адукацыі павінен пайсці ім насустрач.

Для нас вельмі важна таксама, каб пры вырашэнні пытанняў прызначэння стыпендый Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, імянных і персанальных стыпендый улічвалася меркаванне прафсаюзнай арганізацыі і пярвічнай арганізацыі БРСМ, бо, здараецца, паразуменне ў гэтым пытанні дзе-нідзе адсутнічае.

## Кампенсацыя на аздараўленне

Па словах Рамана Дапіры, апошнім часам стала часцей прымяняцца такая форма аказання матэрыяльнай падтрымкі навучэнцаў, як дапамога на аздараўленне. Звязана гэта з дэфіцытам пуцёвак у аздараўленчыя і санаторна-курортныя арганізацыі ў канікулярны час, таму многія студэнты вымушаны набываць пуцёўкі за поўны кошт. У гэтай сітуацыі ўстанова адукацыі бярэ на сабе кампенсацыю пэўнай часткі выдаткаў.

Матэрыяльная дапамога на аздараўленне — гэта таксама і вітамінізацыя, і змяншэнне кошту харчавання ў студэнцкіх сталовых. У БДУІР, напрыклад, кіраўніцтва па ўзгадненні з прафсаюзнай арганізацыяй накіроўвае штомесячна грошы на арганізацыю дадатковага харчавання для студэнтаў з малазабяспечаных сем'яў. Талоны на харчаванне тут атрымліваюць прыблізна 60-70 чалавек кожны месяц.

— Разам з тым, у некаторых установах адукацыі крытэрыі да прызначэння матэрыяльнай дапамогі вызначаюцца настолькі жорсткія, што тая сума, якая выдзяляецца для матэрыяльнай падтрымкі навучэнцаў, цалкам не засвойваецца і гэтыя грошы вяртаюцца ў бюджэт. Мы катэгарычна супраць такіх крайнасцяў. Сродкі, якія выдзяляюцца з бюджэту на сацыяльную падтрымку, павінны накіроўвацца на сацыяльную падтрымку, — падкрэсліў Раман Дапіра. — У нас прадугледжаны таксама механізм матэрыяльнай падтрымкі навучэнцаў за кошт сродкаў, атрыманых ад пазабюджэтнай дзейнасці ўстановы адукацыі. Упэўнены, што гэтую дапамогу трэба прымяняць, у першую чаргу, да студэнтаў платнай формы навучання, паколькі іншыя фінансавыя крыніцы для іх падтрымкі не могуць быць выкарыстаны.

У бліжэйшы час мы плануем больш увагі надаваць рабоце нашых вучэбных камісій, створаных пры прафкамах. Менавіта яны павінны інфармаваць студэнтаў аб умовах прадастаўлення матэрыяльнай дапамогі, зніжак на навучанне, пераводу з платнай на бюджэтную форму навучання і гэтак далей.

## Навучанне — работа, якая аплачваецца

Значным дасягненнем галіновы прафсаюз лічыць прывязку памеру стыпендый да тарыфнай стаўкі першага разраду. Такі падыход значна спрасціў парадак вылічэння стыпендый і паспрыяў іх аператыўнаму пераразліку. У выпадку павышэння тарыфнай стаўкі першага разраду памер стыпендыі павялічваецца аўтаматычна.

Цяпер што тычыцца штомесячных даплат да стыпендый, прадугледжаных Указам кіраўніка дзяржавы № 460 «Аб аказанні дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі навучэнцам». Згодна з гэтым дакументам, надбаўкі прадугледжаны для ўсіх навучэнцаў, якія атрымліваюць вучэбныя, імянныя, сацыяльныя, спецыяльныя і персанальныя стыпендыі савета ўстановы вышэйшай адукацыі. Штомесячная даплата навучэнцам устаноў прафесійна-тэхнічнай адукацыі, навучэнцам і курсантам устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі, студэнтам і курсантам устаноў вышэйшай адукацыі, дзецям-сіротам, дзецям, якія засталіся без апекі бацькоў, а таксама асобам з іх ліку, якія асвойваюць змест адукацыйнай праграмы падрыхтоўкі да паступлення ва ўстановы адукацыі Рэспублікі Беларусь, складае 65 працэнтаў ад стыпендыі. Для аспірантаў і дактарантаў штомесячная даплата ўстаноўлена ў памеры 30 працэнтаў ад стыпендыі. Пры гэтым названыя даплаты не ўлічваюцца пры вызначэнні сродкаў, якія накіроўваюцца на ўстаноўленне надбавак да стыпендый за поспехі ў вучобе, навуковай і грамадскай рабоце і аказанне матэрыяльнай дапамогі.

У адпаведнасці з галіновым пагадненнем, вышэйназваныя выплаты ажыццяўляюцца па прадстаўленнях прафкамаў і камітэтаў БРСМ і з імі ўзгадняюцца адпаведныя загады. Праўда, у большасці ўстаноў адукацыі меркаванне студэнцкіх арганізацый улічваецца ці не ў апошнюю чаргу. Гэта толькі пацвярджае слушнасць той практыкі, якую сёння прапагандуюць Мінадукацыі і галіновы прафсаюз у сваім пагадненні.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

### Памеры стыпендый па стане на 1 верасня 2012 года.

**1. Вучэбныя стыпендыі:**
— студэнтам ВНУ — ад 423,0 да 676,8 тыс. руб.;
— навучэнцам ССНУ — ад 353,3 да 564,8 тыс. руб.;
— навучэнцам прафтэхустаноў — 353,3 тыс. руб.
**2. Сацыяльныя стыпендыі:**
— студэнтам ВНУ — 335,3 тыс. руб.;
— навучэнцам ССНУ — 270,0 тыс.руб.;
— навучэнцам прафтэхустаноў — 270,0 тыс. руб.
**3. Спецыяльныя стыпендыі:**
— студэнтам ВНУ — 672,8 тыс. руб.;
— навучэнцам ССНУ — 555,8 тыс. руб.;
— навучэнцам прафтэхустаноў — 555,8 тыс. руб.
**4. Персанальныя стыпендыі:**
— толькі студэнтам ВНУ — 740,3 тыс. руб.
**5. Імянныя стыпендыі:**
— студэнтам ВНУ — 976,5 тыс. руб.;
— навучэнцам ССНУ — 756,0 тыс. руб.;
— навучэнцам прафтэхустаноў — 756,0 тыс. руб.
**6. Стыпендыі Прэзідэнта РБ**
— толькі студэнтам ВНУ — 600,0 тыс. руб.

*На слыху*

# Платныя адпрацоўкі ў ВНУ, або Колькі каштуе прагул

**НЕКАЛЬКІ тыдняў таму Інстытут журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта запанікаваў: на дэканацкім стэндзе з'явілася інфармацыя пра платныя адпрацоўкі прапушчаных заняткаў. Фотаздымак цыдулкі з «жахлівай» інфармацыяй (многія студэнты не проста супрацоўнічаюць, а ўжо працуюць у рэдакцыях) пусціўся ў «вольнае» плаванне па інтэрнэце. Адразу ўзніклі эканамічныя пытанні: што ж далей рабіць студэнтам, якія ўжо працуюць? За што трэба будзе плаціць, а за што — не? І, наогул, як зараз пачуваюцца студэнты іншых ВНУ?**

### Пагрозы ці жорсткая рэальнасць?

Студэнты БДУ ўсё ж не губляюць надзеі на тое, што развітацца з «залатым» часам бясплатных адпрацовак ім не давядзецца. Каб праверыць, як насамрэч ідуць справы, я накіравалася ў дэканат дзённага аддзялення факультэта журналістыкі БДУ.

**— Пакуль што ніякай інфармацыі ў нас няма, —** паведамілі мне там лаканічна.

Тэлефаную ў прэс-цэнтр БДУ:

**— Ніякіх звестак пра платныя адпрацоўкі няма,** — пацвердзіла начальнік прэс-службы Вольга Шчадрына, — няма загаду і адпаведных дакументаў.

### Або хадзі, або плаці

Першым платныя адпрацоўкі прапушчаных заняткаў увёў Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт. Гэта здарылася яшчэ ў 1990-я гады. А пачалося ўсё са звычайнага патакання студэнтам: наведванне лекцый зрабілі неабавязковым, гэта значыць, хадзіць на іх можна было па жаданні. І на пары народ амаль што перастаў хадзіць. Таму адміністрацыя ўніверсітэта вырашыла пайсці на кардынальныя меры і ўвяла сістэму платных адпрацовак.

Цяпер медыкі плацяць за прапушчаныя заняткі. Прычым сума можа выйсці вельмі ўнушальная. Так, напрыклад, на старшых курсах у адзін дзень ставяць некалькі аднолькавых пар, і выкладчыкі часам ідуць на прынцып — прымушаюць плаціць за ўсе. Вось і губляе студэнт «кругленькую» суму за адзін прагул... Але затое і народу на занятках стала больш...

Практыку платных адпрацовак вырашылі выкарыстаць і іншыя ўніверсітэты — як сталічныя, так і рэгіянальныя. Беларускі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт, Мінскі інстытут кіравання, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі, Гомельскі філіял «Міжнароднага інстытута працоўных і сацыяльных адносін» і некаторыя іншыя вышэйшыя навучальныя ўстановы ўжо выкарыстоўваюць платныя адпрацоўкі, каб «заахвоціць» студэнта хадзіць на заняткі. Чуткі пра адпрацоўкі за грошы пачалі «гуляць» і ў Гродзенскім медыцынскім універсітэце з кастрычніка гэтага года.

### Для каго і два мільёны — не грошы

У Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі платныя адпрацоўкі ўвялі ўжо даўно. Яўген Петрукокіч, студэнт гэтай навучальнай установы, расказаў, як жывецца «інфарматыкам» з платнымі адпрацоўкамі:

**— Сапраўды, адпрацоўкі ў нас платныя, калі прычына пропуску няўважлівая. Кошт розны, у залежнасці ад таго, што ты прапусціў. Ёсць людзі, якія баяцца прагульваць з-за такіх вось адпрацовак, а ёсць такія, што і па два мільёны «адвальваюць»! Як гэтая сістэма ўплывае на наведванне ўвогуле — не магу сказаць дакладна... Але ў некаторых выкладчыкаў платныя адпрацоўкі становяцца сапраўдным фетышам: спазніўся на 5 хвілін — усё, платная адпрацоўка! Я, дарэчы, плаціў аднойчы за здачу «лабы». За 15 хвілін мне прыйшлося заплаціць 12 300 рублёў. А так адпрацаваць адну «лабу» (калі цэлая пара) каштуе 80 тысяч. А ўвогуле, будзеш ты плаціць ці не, залежыць ад выкладчыка і яго стаўлення да цябе.**

У Мінскім інстытуце кіравання таксама дзейнічае сістэма платных адпрацовак.

**— У нас за прапушчаныя практычныя заняткі прадугледжана адпрацоўка і аплата ў суме 80 тысяч рублёў, — расказвае студэнтка інстытута Ксенія, якая папрасіла не называць яе прозвішча.**

**— Натуральна, гэта вельмі шмат. Таксама ў нас платныя перездачы залікаў (40 тысяч) і экзаменаў (80 тысяч). Паколькі я ўсё здаю з першага разу і пары не прагульваю, на мяне гэта ніяк не ўплывае. Але, лічу, аплата завышаная. Звычайна ўсе студэнты стараюцца наведваць пары, часам выкладчык можа пайсці на ўступку, калі была ўважлівая прычына. Але адпрацавачны матэрыял (некаторыя заданні, канспект) усё роўна падрыхтаваць трэба.**

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

*Выпрабавана на сабе*

# МОЛАДЗЬ З ЧЫРВОНЫМІ ПАВЯЗКАМІ, ці Як мы сачылі за парадкам...

**Вы, напэўна, паспелі заўважыць, як павялічылася на гарадскіх вуліцах і ў грамадскіх месцах колькасць тых, хто сочыць за правапарадкам. Відаць, прыгадалі савецкія кінастужкі, убачыўшы людзей з чырвонымі павязкамі на руках. Толькі гэта не кіназдымкі, і нават не флэшмоб. Дружыннікі — рэальныя «персанажы» нашага часу, якіх сёння называюць крыху інакш: члены маладзевых атрадаў аховы правапарадку (МААП) БРСМ.**

Нягледзячы на тое, што хлопцы і дзяўчаты сочаць за правапарадкам штодня, восень для іх — самы напружаны перыяд: нагадвае аб сабе пачатак новага навучальнага года, калі ўсе вяртаюцца з адпачынку. Невыпадкова ў гэтыя дні па ўсёй краіне праходзіць і акцыя «Разам за бяспеку і правапарадак».

На адным з такіх дзяжурстваў давялося пабываць і мне. Разам з актывістамі руху — студэнтам гістарычнага факультэта БДУ, камандзірам маладзевага атрада аховы правапарадку гэтай установы Яўгенам Раўдановічам і двума дружыннікамі — пайшлі ў РАУС Першамайскага раёна сталіцы, каб атрымаць чарговае заданне для іх і першае — для мяне. Супрацоўнікі міліцыі правялі кароткі інструктаж па мерах бяспекі, далажылі аб сітуацыі ў раёне, абазначылі нашы паўнамоцтвы.

...Субота. Цёплы восеньскі вечар. Бульвар Талбухіна. Мітусню машын на праспекце Незалежнасці заглушае гоман моладзі, якая патроху збіраецца на лавачках у парку. Вядома ж, выхадныя!

Наша прысутнасць, відаць, не даспадобы тым, хто прыйшоў сюды адпачыць «на поўную катушку». Таму час ад часу ловім асуджальныя позіркі ў наш бок... Маўляў, самі не адпачываеце і іншым не дазваляеце. А мы проста сядзім на лавачцы, размаўляем, смяёмся. Толькі вось чырвоныя павязкі з надпісам «дружыннік» нас выкрываюць: быццам папярэджваюць моладзь, з якімі мы тут мэтамі.

...Прайшла гадзіна-другая. Тыя, хто сядзеў побач, відаць, пайшлі шукаць іншае месца для адпачынку. Накіраваліся і мы ўглыб парку. Вось тут пасядзець часу ўжо не было. Не паспелі падысці да адной кампаніі, як з іншага боку пачуліся мацерныя словы, звон бутэлек. Убачыўшы нас, хлопцы замаўчалі, кудысьці зніклі бутэлькі.

— Ці ведаеце, што нецэнзурная гаворка і распіццё алкагольных напояў у грамадскіх месцах забаронена? — звяртаемся да моладзі.

— Ды ў нас усё добра! Вам падалося, — пачалі апраўдвацца юнакі і дзяўчаты...

Не паспелі мы адысці, як схаваныя бутэлькі аказаліся на сметніку, а замест мацерных пачуліся нармальныя словы.

Праўда, такія сумленныя кампаніі нам больш не трапляліся. Часцей на нашы заўвагі або не звярталі ўвагі, або... далёка «пасылалі». Для асаблівa «бойкіх» мы выклікалі патруль. Далей з імі разбіралася міліцыя.

Асноўныя правапарушэнні, з якімі мы сутыкнуліся за вечар, — распіццё спіртнога, дробнае хуліганства і знаходжанне падлеткаў на вуліцы пазней за ўстаноўлены час. Нагадаю: тыя, каму яшчэ не споўнілася 16 гадоў, без суправаджэння дарослых не павінны знаходзіцца на вуліцы пасля 23.00.

А такіх, як аказалася, вельмі шмат. І прычына нават не ў тым, што бацькі не ведаюць пра забарону. Яшчэ як ведаюць! Толькі не пра тое, дзе знаходзяцца іх дзеці.

Так аказалася і з бацькамі васьмікласніка Сашы, якога мы сустрэлі ў тым жа парку. Ён разам з дарослымі хлопцамі гуляў у карты. Калі мы спыталі, колькі яму гадоў, той шчыра адказаў:

— Чатырнаццаць.

А на пытанне, ці ведаюць бацькі, дзе ён зараз знаходзіцца, усё з той жа шчырасцю дабавіў:

— Не!

Мы даведаліся, дзе Саша жыве, і прапанавалі давесці яго дадому. Хлопчык згадзіўся.

Пакуль ішлі, ён прызнаўся, што падмануў бацькоў: сказаў, што будзе ў сябра, а сам знаходзіўся ў кампаніі старэйшага суседа. Мы растлумачылі, да чаго можа прывесці такі падман і знаходжанне на вуліцы ў позні час. Хлопчык зразумеў і паабяцаў, што такога больш не паўторыцца. Мы паверылі. Таму не праводзілі яго да самых дзвярэй, а развіталіся каля пад'езда.

...Стрэлка гадзінніка паказвала за поўнач. На гэтым вырашылі разысціся. Патэлефанаваўшы супрацоўніку міліцыі, за якім былі замацаваны, паведамілі аб выкананні задання і абвясцілі, што сёння наша «праца» скончана. Атрымаўшы «дабро», пайшлі.



Уручэнне пасведчанняў МААП у Барысаве падчас старту рэспубліканскай акцыі «Разам за бяспеку і правапарадак».

— Самае галоўнае, што дае рэспубліканская акцыя «Разам за бяспеку і правапарадак», — тое, што за гэты перыяд праходзіць цэлы комплекс мерапрыемстваў прафілактычнага і праваахоўнага кірункаў, — расказвае **першы намеснік начальніка Рэспубліканскага штаба МААП БРСМ Уладзімір ЦЮХАЙ**. — Падчас гэтых мерапрыемстваў членамі атрадаў выяўляюцца правапарушэнні сярод моладзі. Не меншае значэнне мае і прафілактычная работа: юнакі і дзяўчаты пастаянна бачаць супрацоўнікаў міліцыі разам з нашымі дружыннікамі, што лішні раз засцерагае іх ад прыгод.

Прадстаўнікі маладзевых атрадаў аховы правапарадку сваёй дзейнасцю стараюцца ахапіць усю сталіцу. Мяркуйце самі: штодня ў грамадскіх месцах кожнага раёна горада нясуць дзяжурства мінімум 8 сумесных нарадаў — амаль паўтары сотні чалавек! Такая ж дзейнасць вядзецца і ў рэгіёнах. Апошні рэйд з удзелам актыву МААП Мінскага абласнога камітэта БРСМ адбыўся ў Слуцку і Салігорску, дзе правяралі месцы масавага адпачынку моладзі.

— Асноўная катэгорыя затрыманых — звычайна непаўналетнія, якім пасля адзінаццаці вечара знаходжанне на вуліцы і ў грамадскіх месцах без суправаджэння дарослых забаронена, — працягвае Уладзімір Цюхай. — На жаль, шмат і нецвярозай моладзі. Першым пагражае папярэджанне (калі гэта было аднойчы), другім — складанне пратакола, адміністрацыйная адказнасць і пастаноўка на прафілактычны ўлік. І як ні дзіўна, сярод затрыманых — большасць са звычайных нармальных сем'яў: магчыма, часта бацькі не знаходзяць часу на сваіх дзяцей, а гэта нярэдка прыводзіць да трагедый.

Акцыя «Разам за бяспеку і правапарадак» — добрая нагода для юнакоў і дзяўчат праявіць сябе. Усяго за апошнія тры тыдні маладзевыя атрады аховы правапарадку папоўніў звыш 1,5 тысячы маладых патрыётаў. Многія з іх ужо заступілі на сваё першае дзяжурства разам з супрацоўнікамі міліцыі...



Заняткі па спецыяльнай падрыхтоўцы падчас рэспубліканскага вучэбна-метадычнага збору камандзіраў МААП

**Вераніка КАНЮТА.**



# ГРУПА РЫЗЫКІ

## Быць іншым — не значыць быць горшым

**Пакуль дзеці малыя, яны — кветкі жыцця. Глядзіш на іх — і не можаш нарадавацца... Аднак далей у іх пачынаецца пераходны ўзрост, і здаецца, часам яны зусім не ўсведамляюць таго, што робяць. Позірк — ваўчаняці, а лепшы сябар — вуліца. А самае незразумелае — жорсткае стаўленне да некаторых сваіх аднагодкаў...**

Кацярына ў першым класе трапіла ў асяроддзе дзяцей з сем'яў, дзе ніхто не дбаў пра тое, што і як робяць іх «чады». Ды і самі бацькі ўзорам выхаванасці і паспяховасці не былі. Што добра, а што дрэнна, што можна, а што нельга яны сваім дзецям патлумачыць не маглі, таму тыя раслі «пустапасам». А Кацярына заўсёды старалася добра вучыцца. Ёй самой было гэта цікава. Бацькі не мелі патрэбы пастаянна правяраць, ці зрабіла яна хатняе заданне — дзяўчынка сама выконвала ўсё з ахвотай. Такую стараннасць заўважалі настаўнікі і пастаянна хвалілі дзяўчо. Гэта моцна не падабалася аднакласнікам, бо Кацярына атрымлівала добрыя адзнакі, а яны — не. А аднойчы здарылася такая гісторыя. Усім класам сабралі грошы і купілі класнаму кіраўніку падарунак на свята — вазу і паштоўку. Аднак паспелі так дапячы настаўніцу, што тая адмовілася ад падарунка, сказаўшы: «Я вазьму толькі паштоўку, бо яна падпісана рукой Каці». Абурэнне класа ў дачыненні да дзяўчыны стала яшчэ мацнейшым.

Аднакласнікаў раздражнялі яе поспехі. І яны пастаянна і надакучліва кпілі з дзяўчыны. Цяпер, у сталым узросце, яна ўжо не памятае ўсіх падрабязнасцяў, аднак агульная атмасфера была вельмі цяжкой і прыгнятала яе. Кацярына не разумела, што з ёю адбываецца, пастаянна вярталася дадому ў дрэнным настроі, зачынялася ў сваім пакоі. Бацькі не заўважалі нічога небяспечнага, бо дачка любіла займацца сваімі справамі сам-насам — яны ёй і не дакучалі.

У атмасферы здзекаў Кацярына правучылася ўсю пачатковую школу. Змяняліся класныя кіраўнікі, якія нічога не заўважалі. Трывогу забіла толькі класны кіраўнік у пятым класе. Яна заўважыла, што здольная дзяўчынка з'яўляецца ізгоем сярод слабых вучняў. Настаўніца выклікала бацькоў і паведаміла, што калі яны тэрмінова не перавядуць дачку ў іншы клас, аднакласнікі яе проста «з'ядуць». Так у сярэдзіне навучальнага года Кацярына аказалася ў іншым калектыве. Яна прыгадвае, што тады ёй было вельмі нязвыкла: усе навокал да яе так добра ставяцца...

Такія выпадкі ў падлеткавым асяроддзі, на жаль, не рэдкасць. Бываюць і іншыя, з яшчэ большай жорсткасцю і сумным фіналам. Тэрапеўт псіхіятрычнага цэнтра г. Смаргонь Аксана Ціценка расказвае, што ў яе ўрачэбнай практыцы быў выпадак, калі дзяўчынка спрабавала атруціцца таблеткамі з-за здзекаў аднакласнікаў. Адна замешана тут было яшчэ і няшчаснае каханне. Яна сустракалася з хлопчыкам, а ён кінуў яе і расказаў усе падрабязнасці іх адносін аднакласнікам. А тыя, зразумела, не ўпусцілі нагоды пакпіць.

Псіхатэрапеўт адзначае, што звычайна падлеткі сваёй ахвярай выбіраюць таго, хто не такі, як усе. У першую чаргу, гэта дзеці з асаблівасцямі фізічнага развіцця. Часта не даюць жыцця яны і так званым «акулярыкам». Аднак неўзлюбіць дзеці могуць і тых, хто лепшы за іх: больш разумны, больш здольны, больш творчы. У групу рызыкі трапляюць як дзеці з незабяспечаных сем'яў, так і з больш заможных у параўнанні з астатнімі.

**Падлеткі сваёй ахвярай выбіраюць таго, хто не такі, як усе. У першую чаргу, гэта дзеці з асаблівасцямі фізічнага развіцця. Часта не даюць жыцця яны і так званым «акулярыкам».**

Псіхатэрапеўт расказвае, што за кошт іншых падлеткі імкнуцца самасцвердзіцца, даказаць сабе і ўсім, што яны — лепшыя. Дзеці дазваляюць сабе жорсткасць, таму што яшчэ не ведаюць забарон, не баяцца быць пакаранымі. Дарослыя паводзілі б сябе гэтаксама, каб іх не стрымлівалі законы і нормы, прынятыя ў грамадстве.

Як распазнаць, што ваша дзіця церпіць ад нападкаў аднагодкаў? Яно вяртаецца дадому сцішаным, без настрою, ідзе і зачыняецца ў сваім пакоі. Яно замыкаецца ў сабе і не хоча расказваць, як прайшоў дзень, бо адчуванні ад гэтага дня далёка не з прыемных. Можа быць і адваротны варыянт: у знак пратэсту яны пастаянна сыходзяць і прападаюць на вуліцы, не хочуць падпарадкоўвацца бацькам. Яны могуць катэгарычна адмаўляцца ісці ў школу, бо школа ім проста ненавісная.

У такіх выпадках бацькам трэба быць вельмі тактоўнымі, не імкнуцца сілком даznaцца, што адбываецца. З дзіцем павінен размаўляць той з бацькоў, хто мае з ім больш даверлівыя адносіны. Распытваць трэба ў спакойных абставінах, напрыклад, пайсці куды-небудзь паесці і там акуратна пацікавіцца, што насамрэч адбываецца. Калі дзіця не адкрыецца адразу, праз пару дзён паспрабаваць зноў. Пастаянныя гутаркі — лепшы сродак у такой сітуацыі: дзіця не павінна трымаць усё ў сабе, а вам неабходна размаўляць з ім пра гэта столькі, колькі яму патрэбна.

Аксана Ціценка адзначае, што найбольш лёгка наладжваюць стасункі з аднагодкамі тыя, у каго ёсць браты і сёстры, а галоўнае, тыя, хто з самага ранняга ўзросту гуляў з іншымі дзецьмі. Таму, калі вы хочаце засцерагчы сваё малое ад праблем у стасунках з равеснікамі ў будучыні, варта з маленства весці яго гуляць у агульную пясочніцу. З дзіцем нельга губляць пастаянную душэўную сувязь. Трэба тлумачыць яму, што быць іншым — не значыць быць горшым.

**Сёння праблема жорсткага стаўлення падлеткаў да сваіх аднагодкаў — з'ява, характэрная не толькі для нашай краіны, да таго ж і масавая. Па словах дзяцей, што адказвалі на пытанні інтэрнэт-сайта KidsPoll, пакутвалі ад агрэсіўных паводзін аднакласнікаў 48%, у тым ліку 15% — неаднаразова, а самі прыніжалі іншых 42%, прычым 20% — шматразова. У Амерыцы з'явілася і адпаведная назва — булінг (ад англ. bully — задзіраць, пужаць). Азначае яна ганенні і прыніжэнні, якія пераносяць дзеці ў школе. Там з гэтай з'явай прынята змагацца: пісаць у спецыяльных паперах хто, калі і як цябе абразіў, хадзіць на гутаркі да псіхолага разам са сваім крыўдзіцелем, звяртацца да кіраўнікоў школ. У нашай краіне ёсць бясплатныя кругласутачныя тэлефоны даверу для дзяцей і падлеткаў: 8 801 100 16 11. Дзейнічае таксама рэспубліканскі тэлефон даверу 8 017 246 03 03.**

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
10 11 2012 г.

## На конкурс «Новы погляд»

**НАГАДАЕМ, што гэты конкурс — не для пасрэдных аўтараў, здольных хіба што на прымітыўнае інтэрв'ю з пытаннямі накшталт «Ну што ў вас новенькага?». Ён — для тых, хто хоча палюбіць журналістыку ўсур'ёз і надоўга: для неабыякавых, няўрымслівых, энергічных і крэатыўных. Для патэнцыяльных студэнтаў факультэтаў журналістыкі і будучых аўтараў «Чырвонкі»... Ад удзельнікаў конкурсу пад назвай «Новы погляд» мы чакаем не банальныя тэксты, а артыкулы з прэтэнзіяй на... На геніяльнасць? На адкрыцці? На арыгінальнасць?.. Не будзем працягваць, паставім шматкроп'е. Далей — справа за вамі!**

**Траіх пераможцаў конкурсу, які будзе доўжыцца да 1 мая 2013 г., чакаюць прызы. У лепшага з іх ёсць шанц таксама атрымаць ад рэдакцыі накіраванне для паступлення на факультэт журналістыкі ВНУ. Дасылайце свае «пробы пяра» на адрас «Звязды» (у тым ліку і электронны) з абавязковай паметкай: на конкурс «Чырвонка». Новы погляд». Памер артыкула — у межах разумнага.**

# АДНАЎЛЕННЕ З РОЗУМАМ АБО ЗАНЯПАД?

***З дзяцінства памятаю адно падарожжа. Я вырашыла наведаць Грушаўку — сядзібу, якая з XVII стагоддзя належала роду Рэйтанаў. З майго горада туды дабрацца не праблема — усяго паўгадзіны на «веліку». Я даўно не была ў гэтых мясцінах, таму пацікавілася ў мясцовых жыхароў, як знайсці сядзібу. Але яны не змаглі мне адказаць, бо «ніякіх Рэйтанаў не ведалі», а сам сядзібна-парkавы комплекс лічылі вясковай сметніцай. Як жа так? Як можна не ведаць гісторыю нават сваіх мясцін? Памятаю, як я, малая, не змагла зразумець і прыняць гэтую абыякавасць. Мне тады было 10 гадоў...***



На тэрыторыі Ляхавіцкага раёна чатырнаццаць старажытных сядзіб, і ўсе яны — звязаны з гісторыяй Беларусі часоў Вялікага Княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай. Тадэвуш Рэйтан, Фларыян Бохвіц — гэтыя вядомыя людзі маюць прамое дачыненне да Ляхавіччыны. Тут яны жылі , працавалі, пакінулі нашчадкам напаміны пра сябе ў выглядзе сядзіб, таямнічых алей, паркаў... На жаль, цяпер амаль усе помнікі на Ляхавіччыне знаходзяцца, мякка кажучы, у непрывабным становішчы, і кіраўніцтва раёна ніяк не можа знайсці сродкі, каб разабрацца з гэтым бязладдзем.

Напэўна, адзін з самых цікавых помнікаў, якія ёсць на Ляхавіцкай зямлі, — гэта сядзібна-паркавы ансамбль Грушаўка. Дамінік Рэйтан пабудаваў тут шыкоўны каменны дом, разбіў парк рэгулярнай планіроўкі. З гэтага роду паходзіць Тадэвуш Рэйтан — вядомы патрыёт Рэчы Паспалітай, удзельнік барскай канфедэрацыі.

У верасні 1773 года Т. Рэйтан быў абраны паслом ад Навагардскага павета (куды ў тыя часы ўваходзіў Ляхавіцкі раён) на сейм Рэчы Паспалітай. Менавіта на гэтым сейме шляхта Рэчы Паспалітай павінна была прызнаць падзел часткі сваёй дзяржавы паміж Прусіяй, Расіяй і Аўстрыяй. Разам са Станіславам Багушэвічам і Самуілам Корсакам Тадэвуш Рэйтан планаваў, скарыстаўшыся правам забароны «ліберум вета», перашкодзіць падзелу дзяржавы. Але, на жаль, усё адбылося па-іншаму: сейм ператварылі ў канфедэрацыю і рашэнне прымалася пад уплывам большай колькасці галасоў. Калі дакумент, які пацвердзіў падзел РП, быў падпісаны, Тадэвуш Рэйтан, са словамі «Тапчыце мяне, але не тапчыце Радзіму» лёг перад выхадам, не выпускаючы канфедэратаў з залы. Да слова, гэты момант адлюстраваў польскі мастак Ян Матэйка ў карціне « Рэйтан — заняпад Польшчы». Пасля сейма Тадэвуш Рэйтан вярнуўся ў Грушаўку, сваё радавое ўладанне, і жыў у невялікім флігелі, які захаваўся да сённяшніх дзён. Тут ён і скончыў жыццё самагубствам. Па афіцыйнай версіі, страціў псіхічнае здароўе. Але ёсць падставы лічыць, што ўсё было не так проста. Няма ніякіх дакументаў, якія б сведчылі аб вар'яцтве Рэйтана. Магчыма, што чалавек проста не мог абыякава глядзець на тое, як на яго вачах на кавалкі разрываюць Радзіму...

Для мяне Грушаўка — не толькі ўнікальны помнік архітэктуры і гісторыі. На тэрыторыі сядзібы Рэйтанаў стаяла хата, у якой нарадзіўся мой бацька. Там ён правёў усё сваё дзяцінства. У гэтай хаце знаходзілася адна цікавая рэч — дрэваапрацоўчы станок, купляны Рэйтанамі, на якім працавалі нехта з маіх продкаў. Так, мае сваякі працавалі на Рэйтанаў, і лёс гэтага славутага шляхецкага роду нейкім чынам перакрыжоўваецца з лёсам маёй сям'і. Некалькі гадоў таму дом майго бацькі знеслі, а дрэваапрацоўчы станок укралі.

З дзяцінства я памятаю, як тата вадзіў мяне па тэрыторыі былой сядзібы. Брук галоўнай алеі, сядзіба з распісной столлю і фрэскамі на сценах, капліца, рэшткі бровара і лядоўні — усё мяне ўражвала...

Цяпер Грушаўка ў заняпадзе. Ад фрэсак на сценах і столі амаль нічога не засталося, у канюшні XIX стагоддзя трымаюць цялят (таму пах каля сядзібы — жудасны). У гумно, якое мае вельмі незвычайную пабудову, складваюць лён. Дарога да выязной алеі разбіта калгаснай тэхнікай і забруджана, на тэрыторыі сядзібы закладваюць бурты з бульбай...

А між іншым у Грушаўку штодня прыязджаюць турысты з Беларусі, Польшчы, Германіі і іншых краін. З сядзібы Рэйтанаў можна было б зрабіць цікавы турыстычны аб'ект. Да слова, некалькі гадоў таму знайшоўся інвестар з Заходняй Еўропы, гатовы ўкласці ў рэканструкцыю Грушаўкі некалькі мільёнаў еўра. Тут планавалася зрабіць камфартабельную гасцініцу, аднавіць аўтэнтычнае афармленне сцен, столі. А з канюшні XIX стагоддзя — школу верхавой язды. Але гэтая справа не распачалася па банальнай прычыне: на культурна-гістарычны помнік XVIII стагоддзя пакуль няма аніякай дакументацыі.

Хутка Грушаўку можна будзе купіць за некалькі базавых велічынь — яе пераводзяць на баланс камунгаса. Мэта гэтага пераводу — зрабіць дакументы і падрыхтаваць сядзібу на продаж.

Сёння некаторыя сядзібы можна сапраўды набыць за невялікія грошы. Поўны спіс знаходзіцца на сайце Міністэрства культуры. Але адразу ўзнікае пытанне: якім будзе далейшы лёс выкупленых



маёнткаў? І ці не ўзнікнуць новыя праблемы? Напрыклад, у Ляхавіцкім раёне выкуплены маёнтак Фляр'янава (былая ўласнасць Бохвіцаў). Многае з таго, што робіць новы гаспадар, пайшло на карысць сядзібе: устаўлены новыя вокны, рамантуецца дах, вывезена смецце, выкашана трава і г.д. Але калі новы гаспадар бярэцца за знешняе афармленне будынка або робіць нейкія змены ў ландшафтным дызайне паркавай зоны сядзібы, ці не дапускае ён памылак? Напрыклад, пры былых гаспадарках перад домам была створана naзіральная пляцоўка, якая арганічна ўваходзіла ў кампазіцыю парку. Менавіта перад гэтай пляцоўкай, на спавітай плюшчом верандзе, з якой адкрываўся маляўнічы пейзаж, амаль кожны вечар збіраліся госці сядзібы Бохвіцаў. Тут Эліза Ажэшка і Уладзіслаў Рэймант наладжвалі знакаміты «фларыянаўскі тэатрык». Сёння на гэтым месцы высадзілі 100 дубоў у шахматным парадку. Ці хто падумаў пра кампазіцыю, якая б стварыла пэўны настрой і прыгажосць, якімі некалі так славіўся фларыянаўскі парк? Вакол будынка ўздоўж сядзібы звычайны вясковы плот. На фасадзе, на ўзроўні другога паверха, прымацавана пластмасавая скрыня, у якой пасаджана елка...

Мне, пэўна, скажуць, што ўсё гэта лепш за разбурэнне і заняпад. Але чаму зноў робім усё так, быццам жывём адным днём? Чаму адразу не рабіць, як трэба, з розумам, без мітусні і ўсялякага глупства?

**Марына ЖАБІК.**

# «Я НЕ ЖАНЧЫНА З ВОКЛАДКІ»



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Плюс шэраг розных рабочых момантаў, якім звычайна трэба вучыць новага чалавека на тэлебачанні. Прысутнічалі таксама розныя смешныя эпізоды, калі было складана перайсці з англійскай мовы на рускую. Не тыя інтанацыі, паўзы.

***— А чым вас прывабіла перспектыва паўдзельнічаць у здымках «Плэйбоя»?***

— Ва ўсіх краінах, калі ты здымаешся для «глянцу», то за гэта плацяць табе, а не наадварот, як гэта распаўсюджана ў Беларусі. У краінах, дзе існуе якаснае тэлебачанне, тваё з'яўленне на вокладцы выклікае да цябе павышаную цікавасць, дазваляе быць больш дарагім «таварам». Гэта дае больш шанцаў, што цябе запросяць працаваць вядучай. Я разумела, што прыйсці на галандскае тэлебачанне з рускім акцэнтам — раўназначна правалу. А калі ў цябе за спінай не адна вокладка, акцёрская школа, медыя-акадэмія для вядучых, перамога ў тым жа «Апошнім героі», то задача спрашчаецца. Таму гэта быў стратэгічны крок.

***— Некаторыя лічаць, што, каб адбыцца ў жыцці, дыплом зусім не абавязковы. Ці падзяляеце гэта меркаванне?***

— А ў мяне беларускага дыплома і няма — толькі не завершаная вышэйшая адукацыя. Але на маёй рабоце гэта ніяк не адбіваецца. Добра ведаю, напрыклад, што ў Галандыі не ўладкуешся на працу без дыплома. У маім асяродку ёсць людзі, якія маюць па дзве вышэйшыя адукацыі, але яны не змаглі знайсці сябе ў жыцці. А ёсць і такія, хто наогул скончыў толькі школу, але зараз многага дасягнуў. Таму, лічу, што розум і поспех нашмат важней, чым дыплом.

***— Вы шмат чаго паспрабавалі ў жыцці, пабывалі ў розных месцах. Як бы апісалі свой стыль жыцця?***

— Шчаслівы. У мяне добрыя адносіны з бацькамі. Цудоўны брат. Усё жыццё я магла дазволіць сабе займацца толькі тым, што мне падабалася, не пераступаючы праз сябе. Не хацела звязваць сябе непатрэбнымі адносінамі і знаёмствамі. Ніколі не даводзілася нешта цярпець і да нечага прызвычайвацца. У гэтым, на мой погляд, і заключаецца шчасце — калі ты пражываеш жыццё так, як хацеў, і не шкадуеш пра гэта.

***— Калі вашы бацькі разышліся, вы перасталі бачыцца з татам. Не змаглі яму штосьці дараваць?***

— Як пра бацьку нічога дрэннага сказаць не магу. Мы ўвесь час нечым займаліся — хадзілі на паляванне, ездзілі на рыбалку. Ён быў строгім у нейкіх сітуацыях. Сваё дзяцінства, дзе ў мяне былі тата і мама, я памятаю гадоў да дванаццаці. Потым яны разышліся. І тым самым маці дала мне ўрок жыцця: калі нешта паміж дваімі не складваецца, лепш дараваць і адпусціць. Не мае сэнсу захоўваць сям'ю толькі дзеля дзіцяці, якое будзе бачыць бацькоў няшчаснымі.

***— Неяк вы сказалі, што каханне — гэта цуд, якога трэба дачакацца. У вашым жыцці здарыўся цуд?***

— Ведаеце, казаць услых пра гэта не хачу, бо ніколі не ведаеш наперад, як будзе складвацца. Зараз я шчаслівая ў тых адносінах, якія маю, і мяне ўсё цалкам задавальняе. Калі праз нейкі час вы ўбачыце мяне і я буду чакаць дзіця, то гэта і будзе азначаць цуд.

***— Вы і Паша Сыраежкін перамаглі ў гэтым годзе як «Love story года». Гэта той самы цуд?***

— Гэта іншае. Я даведалася пра нашу перамогу, калі была ў Амстэрдаме. Трэба адрозніваць адносіны ў жыцці і адносіны ў працоўным кантэксце, асабліва калі гэта тычыцца шоу-бізнэсу. Мне не патрэбная зараз ніякая рэклама, але калі мае адносіны з кімсьці здольны дапамагчы гэтаму чалавеку прадаць сябе ў добрым сэнсе, то няхай будзе так.

***— А закулісcе шоу-бізнэсу — якое яно з вашага досведу?***

— Усё залежыць ад таго, як падасі сябе. Нехта ставіць сябе ў гэтай сферы пафасна і лічыць, што ён на вяршыні свету, таму што яго паказваюць па тэлебачанні... Я сутыкалася толькі са станоўчым закулiсcем, дзе не было ніякіх інтрыг. А вось з зазнайствам і фанабэрыстасцю даводзілася сутыкнуцца менавіта ў беларускім шоу-бізнэсе.

***— Складана быць жанчынай з вокладкі?***

— Я заўсёды ўмела раздзяляць працу за грошы на публіку і асабістае жыццё. І калі нехта не можа выйсці ў краму ненафарбаваным, то гэта не пра мяне. Проста ніхто не адмяняе догляду за сабой. Выглядаць так, быццам ты ўвесь час пад святлом сафітаў, — гэта залішне.

***— А эксперыменты са знешнасцю — частая з'ява ў вашым жыцці?***

— Маладым заўсёды хочацца многае паспрабаваць. Здаралася рознае. І падраныя джынсы, і сто кос, якія мама заплятала, а потым расплятала па некалькі гадзін. Але любыя эксперыменты былі заўсёды пад наглядам мамы, таму нейкіх кардынальных змен у аблічы я не магла сабе дазволіць.

***— Нейкія «фішкі» самапрэзентацыі маеце?***

— Не, ніколі не імкнулася падаць сябе ў выгадным святле. Я такая, якая ёсць. Калі казаць пра працу, то тут мяне заўсёды выручае «дэмка», своеасаблівае партфоліа. А што датычыцца асабістых адносін, то тут існуюць два варыянты: або людзі разглядзяць маю сутнасць, або проста гэта не маецца людзі, якія мяркуюць пра чалавека толькі па глянцавай вокладцы.

**Алена ДРАПКО.**

*Дэбют у «ЧЗ» і «Маладосці»*

Сяргей МАЦІН:

# АПОШНІ ДЗЕНЬ ДРЭВА

*(казка з элементамі рэчаіснасці)*

Дрэва стаяла на ўскрайку поля. Дакладней, тое, што ад яго засталося пасля ўдару маланкі, — корч у паўтара метра. Дождж, які то сціхаў, то змяняўся на сонца, а то спрабаваў зрабіцца снегам і пераўтварыць лістапад у снежань, знішчаў надзею дрэва на хуткае кананне.

— Няўжо мне прыйдзецца трухлець не адзін год? — роспачна думала дрэва.

З калгаса выехаў аўтамабіль, які вёз малако ў галоўны горад гэтага раёна — Дзяржынск, альбо Койданава, каму як падабаецца. Праехаў паштальён на роверы. Прабег нейкі сабака. Дрэва самотна назірала за гэтым, усё менш і менш спадзеючыся на цуд.

Як вядома, час ад часу цуды ўсё ж здараюцца. Так адбылося і цяпер. З-за павароту з'явіўся юнак, які прыгінаўся пад цяжарам вялікага заплечніка. Па ўсім відаць: ён кіраваўся на лецішча (халера яго ведае, чаго). Юнак падышоў да дрэва і спыніўся побач, думаючы аб чымсьці сваім.

— Спалі мяне!.. — прашаптала дрэва.

Хлопец аж скалануўся ад нечаканасці.

— Хто тут? — усклікнуў ён.

— Я гэта, вішня знявечаная маланкай. Спалі мяне!

— Ты размаўляеш? Ніколі б не падумаў...

— ...Спалі мяне! — у трэці раз выгукнула дрэва і змоўкла.

Хлопец яшчэ раз паглядзеў на рэшткі дрэва.

— Да хаты не так і блізка... Цяжкавата будзе, але я здолею, данясу. Трэба дапамагаць тым, каму рэальна можаш дапамагчы. Нават калі тое, што адбылося хвілінай раней, — галюцынацыя, выкліканая нейкімі хімічнымі рэчывамі ў знявечаным дрэве.

Хістаючы корч сюды-туды, юнак выцягнуў яго з зямлі. Крыху павагаўшыся, узяўся за камельчык левай рукой і пакрочыў па дарозе. Прайшоў крыху. Спыніўся. Перахапіў корч правай рукой. Пакрочыў далей. Шмат разоў ён перакладваў корч з адной рукі ў другую. На чарговай спробе хлопец адчуў, што цяжкімі зрабіліся рукі і як кожны рух адклікаецца болем ва ўсіх пальцах.

— Спыніся, адпачні, потым падкажу, што рабіць далей... — прашаптаў той жа таямнічы голас.

— Дык ты існуеш на самой справе? — здзівіўся юнак.

— Так... А цяпер глядзі: знізу я маю выступ накшталт нагі. Перакульваючы з яго канца на пачатак, ты й дацягнеш мяне да патрэбнага месца.

Хлопец паслухмяна выканаў загад былой вішні. Сапраўды, так стала і лягчэй, і зручней спраўляцца з карчом.

— Можаш пакінуць мяне гадзіны на паўтары тут і заняцца сваімі справамі... — у гэты раз шэпт меў больш цёплую і спакойную інтанацыю.

Юнак паслухаўся. Адчыніўшы схованку для інструментаў, ён узяў рыдлёўку. Нацягнуў на ногі боты замест кедаў, а на рукі — гумовыя пальчаткі замест скураных. Крыху падумаўшы, выцягнуў з кута нейкую ёмістасць.

Праз некаторы час хлопец вярнуўся да дрэва-карча. Павагаўшыся, зайшоў у лазню і ўзяў там сякеру.

— Не хацеў я на ноч заставацца, але калі ўжо такая справа...

Сякера лёгка рассякала драўніну на кавалкі, якія ўжо можна было скарыстаць у якасці паліва. Неба патроху цямнела, але ніводнага агеньчыка не было відаць навокал: які дурань паедзе сюды перад самым пачаткам зімы?

— Дзякуй... — ледзь чутна шаптала дрэва. — Большы кавалак спаліш у каміне, а найцвярдзейшы — у печцы. Першы — маё сэрца, другі — камень, які ляжаў на ім усё жыццё.

— Так і зраблю, — адказаў юнак.

Хлопец занёс дровы ў хату і выйшаў на двор, каб схаваць сякеру і зачыніць лазню.

Калі юнак упэўніўся, што ўсё ў парадку, ён развярнуўся спінай да лазні і паглядзеў навокал. Ён убачыў цёмную прастору і лёгкія сняжынкі, што пачыналі ўжо няспынна хаваць пад сабою ўсё жывое і мёртвае.

— Надыходзіць зіма... — прамовіў юнак, звяртаючыся немаведама да каго. — Заўтра раніцай паеду адсюль, і вецер замяце мае сляды. Потым — вясна, калі сонца пачне каціцца ўгару, да росквіту, лета — трохмесячны прыпынак, новая восень... Што б ні адбывалася ў людскім асяродку — нязменнае кола прыроды працягне свой бясконцы шлях. Нават вайна не спыніць гэтае кола. І так будзе бадай што вечна — прынамсі, калі вымяраць навакольныя падзеі чалавечымі, а не касмічнымі маштабамі.

Скончыўшы імправізаваную прамову, юнак зайшоў у хату і пачаў распальваць агонь. Дзесьці праз пару гадзін ад дрэва засталіся толькі дзве ўзгаданыя вышэй часткі. Тэмпература ў пакоі з пяці градусаў паднялася да сямнаццаці — цалкам прыстойная тэмпература. На пліце закіпеў імбрык, які хлопец тут жа паставіў на стол.

— А цяпер — спалі маю астатнюю частку!.. — прагучаў ледзь улоўны шэпт.

— Хто ж ты ўрэшце? — у чарговы раз запытаўся хлопец.

— Зараз даведаешся. Палі!

Юнак рашуча адчыніў дзверцы грубкі і закінуў туды драўляны камель. Зачыніўшы дзверцы, асцярожна ўзяў у рукі найбольшы кавалак вішні — сэрца невядомай істоты, і паклаў яго ў камін, дзе яшчэ заставаліся маленькія вугельчыкі.

Некалькі імгненняў нічога не адбывалася. Раптам успыхнула полымя, не чырвонае, як звычайна, а памяранцава-сіняе. У паветры запахла вішняй.

Раптам нешта выбухнула ў каміне, і юнак міжволі падумаў, што не трэба было калісьці хаваць там берталетаву соль. Але аднекуль прыйшло разуменне: толькі што адбыўся не хімічны, а магічны працэс.

З іскрак памяранцава-сіняга агню ўзнікла дзяўчына гадоў дваццаці, быццам сатканая са святла. Валасы ў яе былі чарнавата-рудымі, а вочы — цёмна-карычневымі з залатымі водблiскамі. Вытанчаны твар нагадваў штосьці ўсходняе.

— Я — Сакура. Дзякуй табе за тое, што даў мне зараз увасобіцца.

— Адкуль ты з'явілася тут? — толькі і здолеў вымавіць юнак.

| **Лот № 2. Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке** | **Капитальное строение инв. № 450/С-1714, расположенное по адресу: Гродненская обл., г. Слоним, ул. Гнидаша, д. 3, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 425450100001006857 площадью 0,1339 га, срок аренды земельного участка 50 лет** |
| **Начальная цена предмета аукциона – 252 872 394 руб., минимальная цена предмета аукциона – 50 574 479 руб.** | |
| **Продавец недвижимого имущества:** Департамент охраны Министерства внутренних дел Республики Беларусь, контактный телефон: (8 0152) 41 78 96 | |
| **Сведения об объектах недвижимости:** двухэтажное кирпичное здание производственного корпуса с двумя пристройками, 1949 г. п., общей пл. 684,1 кв. м; асфальтовое покрытие 2000 г. п., пл. 253 кв. м; водопроводная сеть стальная 1949 г. п., протяженностью 42,5 п. м | |
| **Условия использования недвижимого имущества*:** вовлечение в хозяйственный оборот в течение двух лет с момента заключения договора купли-продажи | |
| **Условия использования земельного участка:** получение в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработку строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 2 года; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией; осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении земельного участка государственной регистрации права на земельный участок | |
| **Организатор аукциона:** Гродненский областной территориальный фонд государственного имущества (фонд «Гроднооблимущество»), 230023, г. Гродно, ул.17 Сентября, 39 (время работы с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30, кроме выходных и праздничных дней), тел.: (8 0152) 77 29 15, 72 25 18; **www.region.grodno.by, www.gki.gov.by** | |

* В случае невыполнения покупателем условий аукциона продавец вправе расторгнуть в одностороннем порядке договор купли-продажи в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь без возмещения победителю аукциона затрат, расходов, убытков, связанных с его расторжением.

1. Аукцион состоится **13 декабря 2012 года в 11.00** по адресу: 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.

2. Аукцион является открытым, его участниками могут быть граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, а также иностранные инвесторы (иностранные государства, объединения, международные организации, иностранные юридические лица, иностранные граждане, граждане Республики Беларусь, имеющие постоянное место жительства за границей, и лица без гражданства).

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи объектов республиканской собственности на аукционах с применением метода понижения начальной цены, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 8 августа 2009 года № 1049 «О мерах по реализации Указа Президента Республики Беларусь от 7 мая 2009 г. № 238», с учетом норм Декрета Президента Республики Беларусь от 7 мая 2012 года № 6 «О стимулировании предпринимательской деятельности на территории средних, малых городских поселений, сельской местности».

Земельный участок предоставляется победителю аукциона (претенденту на покупку) в аренду без проведения аукциона и без взимания платы за право заключения договора аренды.

3. Заявления на участие в аукционе принимаются Организатором аукциона **по 6 декабря 2012 года до 16.00**, по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39, кабинет 6.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе:**

**уплачивает задаток в размере 24 500 000 руб**. путем перечисления денежных средств на расчетный счет организатора аукциона – фонда «Гроднооблимущество» № 3642900000187, МФО 152101752 в филиале 400 Гродненского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, УНП 500044549; внесение задатка дает право на участие в аукционе по всем выставляемым на аукцион лотам;

подает организатору аукциона заявление на участие в аукционе;

заключает с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

При подаче заявления на участие в аукционе и заключении данного соглашения организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – нотариально заверенная доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя;

представителям юридических лиц просьба иметь при себе учредительные документы.

**К заявлению прилагаются следующие документы:**

заверенная банком копия платежного поручения о перечислении задатка на расчетный счет Организатора аукциона.

юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь: копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица;

юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь: легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;

документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык;

индивидуальным предпринимателем: документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона.

4. После регистрации организатором аукциона заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами лицо, желающее принять участие в аукционе, расписывается в журнале регистрации, после чего такое лицо считается допущенным к участию в аукционе. Лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор аукциона выдает билет участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано.

Перед началом аукциона организатор аукциона проводит заключительную регистрацию лиц, допущенных к участию в аукционе. Заключительная регистрация представляет собой замену организатором аукциона билетов участников аукциона на аукционные номера, под которыми участники аукциона будут участвовать в аукционе. После аукциона его участники обязаны вернуть эти номера организатору аукциона.

5. Продавец обеспечивает возможность заинтересованных лиц предварительно ознакомиться с объектами продажи.

6. Организатор аукциона имеет право снять объект республиканской собственности (единый предмет аукциона) с аукциона в любое время до объявления его проданным.

7. Аукцион начинается с оглашения аукционистом правил проведения аукциона, шага аукциона, который устанавливается комиссией в пределах от 5 до 15 процентов от предыдущей названной аукционистом цены объекта республиканской собственности (единого предмета аукциона).

Аукцион по каждому отдельно взятому объекту республиканской собственности начинается с объявления аукционистом его наименования, места нахождения, краткой характеристики, начальной и минимальной цен объекта республиканской собственности (единого предмета аукциона).

После оглашения данной информации аукционист объявляет начальную цену объекта республиканской собственности (единого предмета аукциона).

При наличии двух участников аукциона и более, желающих приобрести объект республиканской собственности (единый предмет аукциона) по начальной цене, аукционист повышает начальную цену в соответствии с шагом аукциона и называет номер участника аукциона, который первым поднял аукционный номер. Затем аукционист в соответствии с шагом аукциона объявляет новую цену. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимет только один участник аукциона. Аукционист называет новую цену объекта республиканской собственности (единого предмета аукциона) и номер этого участника аукциона трижды и объявляет его победителем аукциона.

Если после объявления аукционистом начальной цены объекта республиканской собственности (единого предмета аукциона) аукционный номер поднял только один участник аукциона, то аукционист называет номер такого участника аукциона трижды и объявляет его победителем аукциона.

Если после объявления начальной цены объекта республиканской собственности (единого предмета аукциона) ни один из участников аукциона не поднял свой номер, аукционист понижает начальную цену в соответствии с шагом аукциона, объявляя новую цену. Начальная цена понижается в соответствии с объявленным шагом до момента, когда один из участников аукциона согласится приобрести объект республиканской собственности (единый предмет аукциона) по объявленной аукционистом цене, но не ниже минимальной.

Если после очередного понижения начальной цены объекта республиканской собственности (единого предмета аукциона) одновременно подняли свои номера два участника аукциона и более, в результате чего победителя определить невозможно, комиссия (организатор аукциона) принимает решение о снятии объекта республиканской собственности с аукциона.

По завершении аукциона по каждому отдельно взятому объекту республиканской собственности аукционист объявляет о продаже данного объекта республиканской собственности (единого предмета аукцион), трижды называя цену, по которой продан объект республиканской собственности (единый предмет аукциона), и номер участника аукциона, ставшего победителем аукциона.

При отсутствии участников аукциона, готовых купить объект республиканской собственности (единый предмет аукциона) по минимальной цене, аукционист называет эту цену трижды, после чего данный объект республиканской собственности снимается с аукциона.

Аукцион по конкретному объекту республиканской собственности признается несостоявшимся, если:

заявление на участие в аукционе подано менее чем двумя лицами;

ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем аукциона.

В случае признания аукциона несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, объект республиканской собственности (единый предмет аукциона продается) такому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Согласие либо отказ лица приобрести объект республиканской собственности (единый предмет аукциона) по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, отражается в протоколе аукциона.

8. Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить сумму затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 рабочих дней со дня утверждения организатором аукциона протокола о результатах аукциона.

9. После совершения указанных действий (не позднее 2 рабочих дней) в установленном порядке с победителем аукциона (претендентом на покупку) продавцом заключается договор купли-продажи объекта республиканской собственности.

10. Оплата стоимости приобретенного объекта республиканской собственности осуществляется в установленном законодательством порядке: победителем аукциона (претендентом на покупку) в течение 30 календарных дней с даты заключения договора купли-продажи.

SEX=БАЛЯСЫ

# СМЕХ — У ЛОЖКУ, ПРАС — У АКНЕ



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**Напачатку анекдот. Уявіце сабе: мароз, заснежаны ўзлесак, возера. На ім — нязграбныя фігуры рыбакоў у кажухах. Але глядзяць яны не ў лункі свае, а раз-пораз кідаюць зацікаўленыя позіркі на бераг. Там стаіць звычайная турыстычная палатка, ад якой аж па́ра ідзе! Чутны гамонка, звон бакалаў, жаночы віск. Нарэшце з палаткі выходзіць напаўаголены мужчына, спыняецца ў снезе, радасна пацягваецца і крычыць на ўсё возера: «Ну, што, мужыкі, няма клёву?» Тыя ў адказ: маўляў, так, няма. «І не будзе! Клёва было толькі што!»**

Ну, а ў нас сітуацыя зусім процілеглая: мінулы выпуск «балясаў» — пра першакурсніц і першакурснікаў — па некаторых водгуках, атрымаўся сумнаватым. Кажуць, што асаблівыя чуллівыя асобы нават слязу пусцілі, прыгадваючы дні сваёй баявой маладосці. Таму сёння — гумар! Самі разумееце, у якой справе. Без яго ж — ніяк, ён суправаджае нас з першых да апошніх дзён.

...У дзіцячым садку. «Мне чатыры гады. А табе колькі?» — «Не ведаю» — «А ты дзяўчынкамі цікавішся?» — «Не». — «Тады тры»... Гэта ўсё толькі пачынаецца...

Калі вучыўся ў пачатковых класах, пра тое, адкуль бяруцца дзеці, нашу вулічную кампанію «адукаваў» Віталік. Самы малодшы сярод нас, але не па гадах «дасведчаны». Памятаецца, мы не вельмі ў тое паверылі, а Колька, у якога нядаўна ажаніўся старэйшы брат, дык увогуле пакрыўдзіўся і ледзьве не біцца да Віталіка палез...

...Сужэнцы вечарам у ложку. «Пачакай, сын яшчэ не спіць!» — «Ды спіць ужо даўно». — «Не, кажу, не спіць». — «Давай праверым. Сынок? Прынясі кубак вады!.. Чуеш, цішыня!»... Нарэшце, задаволеныя сужэнцы ў стоме адкідваюцца на падушкі. І тут у цемры раздаецца дзіцячы голас: «Дык колькі мне яшчэ з кубкам вады стаяць?»

З цягам часу ты разумееш, што гумар — гэта неблагі спосаб пазнаёміцца, зацікавіць. Раней у кампаніі ніколі не гаварыў дакладна, чым займаюся. Аднак мімаходзь часта прыгадваў «брыгадзіра нашай трактарнай брыгады дзядзю Васю». Дзяўчаты, вядома, разумелі, што іх такім чынам бяскрыўдна «разводзяць», але тым цікавей ім было вылічваць — хто ж ты такі насамрэч...

...На нудысцкім пляжы хлопец звяртаецца да дзяўчыны: «Прабачце, калі ласка, я хацеў бы...» — «Ды бачу я, што б ты хацеў!..»

Неяк у студэнцкія часы вярталіся з сябрам з гасцей ад дзяўчат. Ну, і захацелася... Не, не падаўжэння банкету, а проста, паколькі быў добры вечар, пабыць яшчэ на паветры, пагутарыць. Зайшлі ў гастраном на сталічным праспекце, узялі па бутэльцы піва, уладкаваліся на лаўцы каля помніка галоўнаму чэкісту (тады яшчэ можна было... у сэнсе, піць піва на людзях) і пачалі «травіць» адзін аднаму анекдоты. На суседняй лаўцы сядзела дзяўчына — музыку праз навушнікі слухала. Краем вока бачым: зняла іх праз нейкі час. А потым і пытаецца: можна побач з вамі пасядзець. Сядзі, не шкада! «Патравілі» мы так з таварышам з вазок і прычэпчык анекдотаў, ісці сабраліся. А дзяўчына дае паперку з нумарам тэлефона: «Ты вясёлы! Надумаеш — тэлефануй»...

Да нядаўняга часу адзін таварыш даволі ўдала прымяняў прыём пра ягель пры знаёмствах з дзяўчатамі. У нейкі момант гутаркі мімаходзь кідаў: чулі ж, напэўна, пра эксперымент з паўночным мохам? Як, не? Высветлілася, што на некаторых нашых балотах можна з поспехам вырошчваць гэты корм для аленяў — з мэтай развядзення апошніх. «А ягель, як вядома, размнажаецца спорамі... Дарэчы, як вы глядзіце на працэс размнажэння?»

**...«А хто гэта ў вас так стогне?» — «А-а-а... Ды не звяртайце ўвагі: гэта суседка вырашыла зацяжарыць!..»**

...Да ўрача на прыём прыходзіць маладая сямейная пара. Кажуць, што нічога ў іх не атрымліваецца... «Ды не можа такога быць!» — здзіўляецца доктар. «Не, усё, на жаль, так...» «Ну, я выйду, а вы вось тут, на кушэтачцы, яшчэ разік паспрабуйце». У калідоры сустракае калегу, расказвае пра рэдкі выпадак. Калега пачынае распытваць пра прыкметы той пары, а потым і кажа: «Гані ты іх прэч са свайго кабінета! Гэта ж студэнты! Ім папросту няма дзе!..»

У студэнцкія часы знаёмая неяк строга наказала сваім сяброўкам: «Убачыце каля майго акна прас — да мяне ні нагой! Хлопец у гасцях... «Ну, дзяўчаты аднойчы і «заваліліся» ўсёй кампаніяй... у забаронены (намечаны прасам) час. А на абурэнне гаспадыні адказалі: ды сябра твайго нарэшце пабачыць захацелі! Наколькі ў гэтай сітуацыі было смешна самому хлопцу — гісторыя замоўчвае...

...Бацькі нечакана вяртаюцца з дачы раней абяцанага тэрміну. А ў кватэры... Думкі кожнага. Хлопец: «Усё, «спаліўся». Дзяўчына: «Цяпер ён са мной ажэніцца!». Бацька: «А сынок ужо вырас». Маці: «Божухна, як яна ляжыць? Хлопчыку ж нязручна!»

У падобную сітуацыю неяк патрапіў мой школьны сябар. Вырашылі яны разам з бацькам адрамантаваць машыну. Толькі распачалі, як бацька таварыша дастае з «бардачка»... жаночыя стрынгі. Трэба сказаць, што сябар да таго часу ўжо шмат гадоў шчасліва жыў у шлюбе, меў дзіця. Карацей, нямая сцэна, слоў няма. Ні ў яго, ні ў бацькі. Потым разабраліся. Прыгадалі, што ўсёй сям'ёй ездзілі на пляж, і дачка-старшакласніца пераапраналася ў машыне...

...«А хто гэта ў вас так стогне?» — «А-а-а... Ды не звяртайце ўвагі: гэта суседка вырашыла зацяжарыць!..» Такую гісторыю — пра празмерна актыўных (у сэнсе асабістага жыцця) суседзяў — можа расказаць практычна кожны жылец шматкватэрнага дома. Сітуацыя неадназначная: ці то злавацца, ці то зайздросціць! Я, зразумела, злаваўся. Але калі аднойчы сціхла ўсё, нават хвалявацца пачаў: не хапаць стала чагосьці...

І нарэшце, вяртаючыся да пачатку... Каб заўсёды было толькі клёва! Ці хаця б смешна!..

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**


УНП 190017558

**Внеочередное общее собрание акционеров открытого акционерного общества «МОТОВЕЛО» (г. Минск, проспект Партизанский, 8) состоится 16 ноября 2012 г. по адресу: г. Минск, проспект Партизанский, 8 в заочной форме**

Орган, по решению которого созывается общее собрание акционеров: Наблюдательный совет ОАО «МОТОВЕЛО».

**Повестка дня:**

1. Об уменьшении уставного фонда ОАО «МОТОВЕЛО».
2. О внесении изменений и дополнений в устав ОАО «МОТОВЕЛО».
3. Об утверждении цены выкупа простых (обыкновенных) акций ОАО «МОТОВЕЛО» по требованию акционеров.

Бюллетени для заочного голосования акционеры получают с 12 ноября по 13 ноября 2012 г. по адресу: г. Минск, проспект Партизанский, 8, юридический отдел ОАО «МОТОВЕЛО», с 9.00 до 17.00 (обеденный перерыв с 13.00 до 14.00), под роспись при предъявлении паспорта (для представителей акционеров – паспорта и доверенности).

Акционеры обязаны возвратить заполненные бюллетени для заочного голосования по указанному адресу не позднее 17.00 13 ноября 2012 г.

С проектом решений собрания, изменений и дополнений в устав ОАО «МОТОВЕЛО», формой и текстом бюллетеня для заочного голосования акционеры могут ознакомиться с 12 ноября по 13 ноября 2012 г. по адресу: г. Минск, проспект Партизанский, 8, юридический отдел ОАО «МОТОВЕЛО», с 9.00 до 17.00 (обеденный перерыв с 13.00 до 14.00).

Список лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, составлен на основании данных реестра владельцев акций ОАО «МОТОВЕЛО» по состоянию на 8 ноября 2012 г.

Выкуп акций по требованию акционеров производится по номинальной стоимости. Заявления от акционеров о выкупе акций по требованию акционеров принимаются 16 ноября 2012 г.


# «ЭПІДЭМІЯ» ПАХУДЗЕННЯ

**На мой асабісты (жаночы) погляд, «лішніх» кіло не бывае. Усё, што ёсць у чалавечым арганізме, для чагосьці трэба. Але ж не сакрэт, што стройныя фігуры якіх больш цешаць і прыцягваюць вока.**

Ёсць у мяне адна знаёмая, якая ў трыццаць з «лішкам» гадоў, маючы ўжо дваіх дзяцей, вырашыла пахудзець. На той момант яна важыла каля дзевяноста кілаграмаў. Сабрала, што называецца, волю ў кулак, пачала піць больш вадкасці, не ела пасля васямнаццаці гадзін, перайшла паразважна на гароднінае меню... Гародніну ў большасці выпадках ужывала ў сырым выглядзе або піла свежавыціснуты сок. Грэчку ніколі не варыла, а толькі замочвала ў вадзе. Ад макаронных вырабаў увогуле адмовілася. Мяса не смажыла, а толькі варыла ці тушыла. І ўрэшце яна атрымала тое, што хацела. Пахудзела да шасцідзесяці кілаграмаў. Але... Паўсядзённы стрэс, работа, сям'я і кухня адбіралі шмат часу. Таму дыета і прыгожая фігура адышлі на другі план. І праз некаторы час кілаграмы, як старыя сябры, вярнуліся. Але яна не гэтым больш не замарочваецца, кажа, што ўсе любяць яе менавіта такой — рукжовашчокай і вясёлай...

Калі ўсё ж вам захацелася пагуляць у займальную гульню «пазбаўся ад лішніх калорый», можна паспрабаваць зрабіць гэта без гвалту над арганізмам. Для гэтага спатрэбіцца зусім не так шмат намаганняў. І тыдні праз два можна будзе зрабіць маленькае радаснае адкрыццё: любімая спадніца злёгку абвісае...

## ПРЫБІРАННЕ

Так, менавіта, гэтая абавязковая працэдура выдатна спрыяе пазбаўленню ад лішніх калорый. Дыван будзе чысцей, калі папоўзаць па ім з анучай, а не з пыласосам. Мы ж атрымаем дадатковую карысць — вось ён, выдатны прыклад сумяшчэння!

## ПРАГУЛКІ ПЕШШУ

Давайце паспрабуем хоць зрэдку пераадольваць сябе, і замест таго, каб чакаць аўтобус, пройдзеш пару прыпынкаў пешшу. Надвор'е добрае, вечар ціхі, стомленасць знікла! Аўтобус? Які аўтобус? Потым, глядзіш, і раніцай пачнём пешшу хадзіць. Часу гэта патрабуе не шмат, а між тым нават 15-хвілінная штодзённая хадзьба дапамагае скінуць лішнюю вагу.

## КАХАННЕ

Гэта адзін з тых рэдкіх варыянтаў, калі адбова зайцы забіваюцца адным трапным выстралам: карыснае спалучаецца з прыемным.

## ХАТНІЯ ЖЫВЁЛЫ

Сабака — сябар чалавека, які патрабуе вячэрняй прагулкі. Гэтым ён можа саслужыць добрую службу. А калі сабака яшчэ і вялікі...

## МЫЦЦЁ МАШЫНЫ

Не для ўсіх. Але калі ёсць машына і як мінімум хвілін сорак вольнага часу, то гэта выдатны варыянт. 100 кілакалорый за 25 хвілін актыўнай працы.

## ТАНЦЫ

Неабавязкова адразу ж запісвацца ў гуртох. Аднак 15 хвілін актыўных рухаў пазбаўляюць ад 100 кілакалорый, а ўжо калі на дыскатэку схадзіць, то, магчыма, размінкі хопіць на некалькі дзён. Але нават не думайце расслабляцца.

## ЛЕСВІЦЫ

Далоў ліфты! З гэтага часу хадзім толькі па лесвіцах. Гэта, вядома, не альтэрнатыва зарадцы, але добры спосаб ва ўмовах недахопу часу падтрымліваць сябе ў форме.

## ШОПІНГ

І яшчэ раз аб сумяшчэнні карыснага з прыемным: чым даўжэй мы ходзім па крамах, прыдзіраючыся выбіраючы патрэбную рэч, тым больш кілакалорый скідаем. Ды і верагоднасць знайсці тое, што нас цалкам задаволіць, несумненна, вышэй.

## ДОГЛЯД РАСЛІН

Выдатны шанц для тых, хто любіць хатнія расліны. Паліць, працерці лісточкі ад пылу, перасадзіць — чым не праца?

## АКТЫЎНЫ АДПАЧЫНАК

Варыянтаў шмат, але адзін з самых простых і даступных — боўлінг. Збіраем сяброў і ідзём катаць шары! Задавальненне забяспечана, пазбаўленне ад 200 кілакалорый (як мінімум) таксама. Для эстэтаў і тых, хто любіць экзотыку, — конны спорт. Практычна ні адзін від спорту так не спрыяе пазбаўленню ад лішняй вагі, як гэты. Не менш каштоўныя і зносіны з жывой істотай.

Калі прытрымлівацца правілаў правільнага пахудзення — гэта не толькі забяспечыць прыгожую фігуру, але і навучыць цярпенню, прымусіць бавіць час з карысцю. Таму худзейце, калі ласка, з розумам і карысцю для свайго арганізма.

**Ганна БУРАК.**

## БРЭЙН-РЫНГ... ПА КРЫМІНАЛЬНЫМ ПРАВЕ

**Аказваецца, Крымінальны кодэкс — гэта не проста артыкулы і санкцыі, але і падстава для захапляльнай гульні.**

Каманды шасці беларускіх ВНУ выйшлі на брэйн-рынг у Гродне, каб паспаборнічаць у веданні крымінальнага права. Адбылося 15 гульняў па кругавой сістэме, удзельнікі адказалі ўвогуле больш чым на 200 пытанняў. Перамагла каманда Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы (Дар'я Ключко, Віталь Карвацкі, Кацярына Панас, Марына Падабедава, Антон Гарковіч і Ганна Булатая), на другім месцы — студэнты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, на трэцім — Акадэміі Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**


ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12 ад 19 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»; грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказны за выпуск — намеснік галоўнага рэдактара Наталля КАРПЕНКА.

Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Кантактны тэлефон: 292 44 12.
e-mail: posts@tut.by; info@zvyazda.minsk.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 26.109.
Нумар падпісаны ў 19.30 9.11.2012 г.

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 36 (166)

■ Падзея «Лістапада»

## Сяргей ЛАЗНІЦА:

# «БЫКАЎ — ВЕЛЬМІ ВАЖНЫ ПІСЬМЕННІК»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Таму і сам факт таго, што паводле аповесцяў Васіля Быкава можна здымаць сучаснае, актуальнае і зразумелае не толькі нам кіно, не дзіўны: гэта прадэманстраваў рэжысёр Сяргей Лазніца. Яго фільм «У тумане» сёлета быў паказаны на бадай самым прэстыжным у свеце Канскім кінафестывалі і атрымаў прыз FIPRESCI. Радасны сам факт, што фільм, дзе на самым пачатку даецца спасылка на беларускага пісьменніка, аўтара аповесці, быў высока ацэнены ў свеце. Але не менш радасна, што існуе вялікая ўвага беларускага гледача: на ўсіх паказах у рамках кінафестывалю «Лістапад» залы былі поўныя. Значыць, у нас ёсць цікавасць не проста да ваеннай тэмы, а да быкаўскай тэмы вайны ў душы чалавека, вайны, якая неабавязкова звязана з ваеннымі дзеяннямі і войскамі, абаронай кагосьці ці чагосьці. У нас ёсць цікавасць да таго, як і ў залежнасці ад чаго чалавек робіць свой выбар. А гэта тэма вечная. І вельмі беларуская. Таму што Васіль Уладзіміравіч пісаў найперш пра псіхалогію герояў, якія паходзілі з таго народу, які ён добра ведаў.

Беларускі выбар — тэма яшчэ вельмі актуальная. Думалася пра гэта пасля прагляду фільма «У тумане», які зроблены вялікімі прафесіяналамі ў аператарскай справе, з вельмі цікавым натуральна-беларускім гукавым радам (рыпіць снег, ламаюцца трэскі, шуміць вецер, скрыпіць дрэва), з акцёрамі, якія адпавядаюць беларускаму тыпажу. Рэжысёр, які паходзіць з Беларусі, здолеў ухапіць вобраз тае зямлі, якая гэтых герояў нарадзіла. Ён жа вельмі тонка, але з халодным, дакладным разлікам, здолеў перадаць думку пра тое, з чым чалавек не можа жыць на свеце. І чаму ён не можа жыць... Насамрэч галоўны герой Сушчэня — чалавек вельмі шчыры. Але як сказалі б цяпер — не змагар. Змагар паспрабаваў бы выжыць, можа быць, даказваць, можа быць, «крывёй змыць» няхай і несправядлівае абвінавачанне. Ён бы імкнуўся, ён бы хацеў. Але яго шчырасць і беларускі розум прывялі яго да самазнішчэння. Мы ў фільме за гэтым назіраем нібыта збоку, нібыта не ўдзельнічаючы ў яго лёсе. Не хвалюючыся за яго, не перажываючы, нібыта староння назіральнікі: гэта яго самазнішчэнне...

**<u>Акцёр Уладзімір СВІРСКІ, ураджэнец Беларусі. Але рэжысёр знайшоў яго ў Маскве</u>:**

**— Я сядзеў у сталоўцы ў ГІЦІСе. Сам пра сябе казаў: «Госпадзі, дай мне такую ролю, каб можна было патраціцца.» Падыходзіць да мяне Рыгор Дабрыгін, які сыграў ролю ў фільме «Як я правёў гэтым летам» і атрымаў за яе прыз на Берлінскім фестывалі. Ён кажа: «Вова, не галі бараду, ёсць для цябе роля». Ён у Берліне сустрэў Сяргея Лазніцу, які сказаў, што шукае акцёра на ролю Сушчэні. Ён сказаў, што ведае такога хлопца... Потым Сяргей прыехаў у Маскву. Мы сустрэліся. Доўга гаварылі. Сяргей мяне фатаграфаваў, нічога не рэпеціравалі. Я гаварыў пра сябе, як я жыву, чым я жыву, што раблю. Потым мне сказалі: «Да сустрэчы...»**

Пасля мне захацелася перачытаць аповесць. Безумоўна, фільм, як бы ён ні быў якасна зроблены, не можа перадаць таго аўтарскага псіхалагізму, які ёсць у словах. Аповесць і фільм — усё-такі два розныя творы. Але ёсць і там, і там тое галоўнае, пра што хацелася думаць пасля, і што можа быць ішло ад самога аўтара, які вельмі добра ведаў беларусаў: праблема выбару, якая пераходзіць у праблему самазнішчэння, калі не хочацца жыць з тым, што ёсць, але і па-іншаму немагчыма. І тады прасцей прыйсці да думкі, што жыць немагчыма наогул. Прызнанне таго, што выйсця няма, — у нейкім сэнсе беларускі выбар. Таму што на паверхні, сам нібыта просіцца. Для таго, хто па натуры «не змагар», але хоча быць шчырым і чыстым перад усімі, думаючы пра будучыню сям'і, дзіцяці. Абгрунтаванне для таго, каб не быць, таксама можна знайсці.

Паглядзеўшы і перачытаўшы наноў аповесць, я адкрыла для сябе нашмат больш, чым проста выбар асобных герояў. Не ведаю, ці ставіў пра гэта свой фільм рэжысёр і ці ўкладваў гэтую думку аўтар. Але Быкаў сапраўды вялікі пісьменнік, таму што яго можна асэнсоўваць бясконца ў кантэксце як агульнага беларускага, так і проста чалавечага выбару...

**Рэжысёр Сяргей Лазніца казаў пра блаславенне ад Быкава на здымкі фільма:**

— На мой погляд, гэта вельмі важны пісьменнік, і аповесць мяне настолькі ўсхвалявала, што я не здолеў пакінуць думку аб тым, што павінен рабіць карціну... З Васілём Быкавым мы кантактавалі. Некалькі разоў я тэлефанаваў, яшчэ ў 2002 годзе, калі толькі ўзнікла задума. Васіль Быкаў жыў тады ў Фанкфурце-на-Майне. Ад яго просьба была такая: не ўцягваць у напісанне сцэнарыя. Я разумею, што ў яго былі вельмі важныя рэчы, якія ён стараўся закончыць. Ён пажадаў мне ні пуху ні пер'я.

**<u>Пра ўдзел Беларусі ў вытворчасці карціны</u>:**

— Я хацеў бы падзякаваць кінастудыі «Беларусьфільм» за ўдзел у стварэнні гэтай карціны. Некалькі краін мелі дачыненне да яе вытворчасці: Германія, Расія, Беларусь, Латвія і Нідэрланды. Карціну хацеў рабіць даўно — я напісаў сцэнарый у 2002 годзе. Мы імкнуліся «запусціць» гэтую карціну. Але я чакаў 10 гадоў, каб гэта адбылося.

Я шукаў грошы, шукаў магчымасці паставіць фільм. Потым я дапрацоўваў сцэнарый два гады таму, ужо перад тым, як здымаць карціну.

Бюджэт карціны склаў 2 мільёны 100 тысяч еўра — гэта ніякі не сакрэт. Менавіта таму да ўдзелу і далучаны 5 краін. Я раблю ўжо другую карціну разам з міжнароднай групай. Над стварэннем фільма «У тумане» працавалі грамадзяне 9 краін. Самая вялікая частка грашовага ўнёску — з боку Германіі. Акрамя таго — апаратура, асвятляльнікі і г. д. Але вось такі супольны ўдзел, калі грошы ідуць з розных краін, дае магчымасць зрабіць карціну. Роля Беларусі ў стварэнні гэтага фільма такая ж, як роля Германіі ці Расіі. Калі вы складаеце бюджэт, то там кожная частка важная. Гэта першае. І другое, мне было вельмі важна, каб Беларусь прымала ўдзел у гэтай карціне. Можаце вы ўявіць фільм паводле Быкава без удзелу нашай краіны? Я думаю, што гэта важна і для Беларусі.

**<u>Пра атмасферу на здымачнай пляцоўцы</u>:**

— Калі я толькі вучыўся рэжысуры, мне выкладчык казаў: «Фільм патрэбны толькі табе, і гэта будзе шчасце, калі ты сустрэнеш аператара, які будзе думаць гэтак жа, як ты, і будзе гэтак жа хацець зняць карціну». Я сустрэў не толькі аператара, я сустрэў мастака-пастаноўшчыка, мантажора, мастака па касцюмах. Я сустрэў групу цудоўных людзей, выдатных акцёраў. У нас была атмасфера творчага адзінства: усе хацелі зрабіць фільм. Таму ў нас атрымалася зрабіць карціну за кароткі тэрмін — усяго за 28 здымачных дзён. Гэта вельмі хутка. Але гэтаму папярэднічала сур'ёзная падрыхтоўка, мы дастаткова доўга рэпеціравалі — 2 месяцы доўжыўся гэты перыяд... Здымалі ў Латгаліі — гэта тэрыторыя, па якой прайшлі немцы. У Першую сусветную вайну там доўга стаяў фронт. І дагэтуль засталіся снарады на паверхні. Зямля параненая...



**<u>Уладзімір СВІРСКІ</u>:**

**— За час здымкаў я выкапаў 27 магіл. Некалькі разоў мы мянялі чаранок для рыдлёўкі. Ён пастаянна ламаўся. Адзін раз я ўдарыў у нешта стальное, як падалося — паляцелі іскры. Мы выскачылі з магілы, у розныя бакі разбегліся. Выклікалі мінёраў. Падалося, што гэта снарад. Але ў выніку гэта аказаўся камень, але вельмі згладжаны, што здавалася абалонкай снарада...**

**<u>Пра рускую мову фільма</u>:**

— Тут ёсць некалькі прычын. Я хоць і нарадзіўся ў Беларусі, але вырас у Кіеве, не вельмі добра валодаю беларускай мовай. Акрамя таго, ёсць пытанне акцёраў. Неабходна, каб была індустрыя, каб былі добрыя акцёры і ім не патрэбна было вучыць мову. Ёсць яшчэ пытанне тэрыторыі пракату: расійская тэрыторыя — гэта 250 мільёнаў гледачоў.

**<u>Пра выбар акцёраў</u>:**

— Анджэй Вайда казаў, што рэжысёр двойчы перад тым, як рабіць карціну, павінен папрасіць парады ў Госпада Бога. Першы раз — калі выбірае тэму. І другі раз — калі выбірае акцёра на галоўную ролю. Гэта два самыя складаныя пытанні. Таму што астатняе я ведаў — што і як я хачу рабіць. У мяне было дастаткова часу, каб прыдумаць карціну, а ўсё астатняе было справай тэхнікі, вопыту, трэнінгу і г.д.

**<u>Пра экзістэнцыяльны выбар</u>:**

— Калі ўзгадваць філасафаў-экзістэнцыялістаў, то К'еркегор гаварыў пра выбар, а Ніцшэ казаў пра волю. У нашым выпадку, калі разглядаць сітуацыю, у якую трапляюць героі «У тумане», — варта ўзгадваць К'еркегора: так, тут пытанне выбару. Не ведаю, ці экзістэнцыйны я рэжысёр?.. Але аповесць пра гэта — пра выбар. Пра стрыжань. І што важна для мяне — герой не філосаф, ён не задае сабе такіх пытанняў. Ён такі па сваёй прыродзе.

Гэта, па сутнасці, прытча. Прытча кажа нам пра тое, што невядомае — невядома. Гэта паводле Кафкі. Што тычыцца героя, то я скажу, што ў яго не было іншага шляху. З тым характарам, так, як ён быў напісаны, іншае выйсце немагчыма. Нехта, хто жыве зараз, можа сысці. Ён не можа сысці. Але і з гэтым жыць не можа. Але і разумее, што даказаць таксама нічога немагчыма.

Я стараўся захаваць думку аўтара, якая гучыць у аповесці. І я абсалютна згодны з гэтай канцоўкай. Лічу, што трэба ставіць кропку і што адкрыты фінал увогуле немагчымы. Інакш вы згубіце думку. Інакш вы згубіце аповесць. Інакш вы згубіце сэнс фільма. Тут вельмі цікавая рэч: адзін гук робіць думку. Калі ўбраць яго — будзе іншая думка.

**<u>Пра гукавы фон</u>:**

— Музыка тут не патрэбна. На мой погляд, яна гучала б як каментарый, таму што музычная тэма ёсць моцны складнік. Тут абсалютна непатрэбны каментарый. Мне не патрэбна такая эмоцыя: яна пазбаўляе вас пачуцця і магчымасці мець больш глыбокую эмоцыю, аблягчае вашу наканаванасць як гледача. Я б гэтага не хацеў рабіць.

**<u>Пра тое, што герой нясе параненага як свой крыж</u>:**

— Я не магу сказаць, што не думаў пра гэта. Але магу сказаць, што не гэта рабіў...

**<u>Пра тое, ці не думае здымаць далей паводле Быкава</u>:**

— Наступная карціна ў мяне іншая. Але так, я думаю...

**Запісала Ларыса ЦІМОШЫК** ■

## НАЗВАЛІ НАЙЛЕПШЫЯ ФІЛЬМЫ

### А тым часам сталі вядомыя вынікі асноўных конкурсаў XIX ММКФ «Лістапад»

Такім чынам, Гран-пры «Золата «Лістапада», якое прысуджала журы асноўнага конкурсу гульнявога кіно на чале з Андрэем Звягінцавым, дасталася стужцы «У тумане» (Германія-Расія-Беларусь-Латвія-Нідэрланды), рэжысёр — Сяргей Лазніца. Прыз «За найлепшую рэжысуру» — Васілю Сігараву (фільм «Жыць», Расія). Прыз «За найлепшую аператарскую працу імя Ю. Марухіна» — Аадэлю Надэх-Фарахані (фільм «Крутая Колка», Латвія, рэж. Юрыс Пошкус) за візуальную магію ўвасаблення рэальнасці. Спецыяльны прыз журы — за бліскучае адкрыццё новага вымярэння ў жанры камедыі — фільму «Расказы» (Расія) рэжысёра Міхаіла Сегала.

*(Заканчэнне на 6-й стар.)*

# БАЛЬ! БАЛЬ! БАЛЬ!



Шляхецкі баль у Віцебску.

**Сёння ў Нясвіжскім палацы ўпершыню з часоў Радзівілаў адбудзецца сапраўдны баль. Галоўныя ініцыятары гэтага балю — Міністэрства культуры і Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж» — пазіцыянуюць незвычайнае мерапрыемства як адраджэнне традыцыі палацавага балю ў Беларусі.**

— Палацавыя балі на Беларусі праводзіліся з XVII ст. традыцыйна пры палацах, сядзібах і былі паказчыкам культурнага жыцця. Сцэнарый правядзення баляў у розныя эпохі меў свае асаблівасці, — распавядае першы намеснік міністра культуры Уладзімір КАРАЧЭЎСКІ. — Абавязковым атрыбутам была бальная карта танцаў, якая ўключала вальс, паланэз, кацільён, французскую кадрылю. У перапынку праводзіліся гульні, чытанні вершаў, музыцыраванне, фуршэт і зноў танцы. Ставіліся спектаклі, запрашаліся знакамітыя музыканты з Італіі, Францыі, Германіі. Славіліся балі, якія ладзіў у Нясвіжы Караль Станіслаў Радзівіл (Пане Каханку). Баль у Нясвіжы стане цудоўным працягам адраджэння бальнай традыцыі ў Беларусі. Наўздагон балям, якія ладзяцца ў нашым Оперным тэатры.

*(Заканчэнне на 6-й стар.)*

# БАЛЬ! БАЛЬ! БАЛЬ!

*(Заканчэнне. Пачатак на 5-й стар.)*

Удзел у балі возьмуць больш за 15 творчых калектываў і 170 артыстаў з Беларусі, Расіі, Украіны, Германіі, Ірландыі. Гэта вядомыя дзеячы культуры і мастацтва: салісты Вялікага Тэатра Оперы і балета Беларусі і Расіі. У праграме — беларускія інструментальныя і танцавальныя калектывы: сімфанічны аркестр Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра, заслужаны аматарскі фальклорна-этнаграфічны калектыў «Неруш», сярэднявечны вулічны тэатр «ДэГрыза»; ансамбль «Тутэйшая шляхта», студыя гістарычнага танца «Версаль», квартэт «Асторыя», музычны дом «Класіка», школа старадаўняга танца «Залаты двор», Нясвіжскі тэатр імя Уршулі Радзівіл, а таксама папулярны расійскі калектыў «Кватра» і нямецкая кавер-група Sculer Cover Band (Берлін). Але, відаць, найбольшае здзіўленне і захапленне (у каго што) выклікалі імёны вядучых балю ў Нясвіжы. Імі станць Аліна Краўцова (Беларусь) і Марат Башараў (Расія). Дапамагаць вядучым будуць Міс Беларусі-2008 Вольга Хіжынкова і Міс Свету, мадэль і актрыса з Ірландыі Rosanna Davison. Цудоўна, безумоўна, што вядомыя людзі з-за мяжы будуць прысутнічаць на нашым балі. Няхай гэта будуць музыканты, італьянскія кухары (дарэчы, менавіта яны будуць адказваць за кухню на нясвіжскім балі). Але ўсё-ткі хочацца, каб гэта быў менавіта беларускі баль — з беларускай мовай, беларускімі традыцыямі і беларускімі «зоркамі» на чале.

Сярод іншых ганаровых гасцей балю будуць вядомыя рэжысёры — народны артыст Беларусі Аляксандр Яфрэмаў і народны артыст Расіі Станіслаў Гаварухін; акцёры — народны артыст Беларусі Віктар Манаеў і народны артыст Расіі Дзмітрый Харацьян; сусветна вядомыя балерыны — народная артыстка Беларусі Вольга Гайко і заслужаная артыстка Расіі Анастасія Валачкова.

У рамках Палацавага балю ў Нясвіжы пройдзе дабрачынная акцыя па зборы сродкаў на рэстаўрацыю Навагрудскага замка. Дарэчы, наконт сродкаў. Для таго, каб патрапіць на гэты баль, вам спатрэбіцца нямала грошай. І хаця ў Мінкультуры паабяцалі, што будуць прадугледжаны і бюджэтныя варыянты, але іх цэны пакуль невядомыя. А асноўны кошт вагаецца ад 1,5 млн да 8,5 млн руб. на чалавека. Таму, напэўна, не ва ўсіх аматараў традыцый беларускай культуры будзе магчымасць патрапіць на баль, пра які яны, магчыма, марылі ўсё жыццё.

**У сувязі з правядзеннем балю ў Нясвіжы я не магла не прыгадаць цудоўных людзей з Віцебска, якія вось ужо некалькі гадоў займаюцца адраджэннем беларускай бальнай культуры на лакальным узроўні. Кіраўнік клуба культурна-гістарычнай рэканструкцыі «Паўночная вежа» пры цэнтры народных рамёстваў і мастацтваў «Залатое кола Віцебска «Дзвіна» Эла ПЕТРАЧЭНКА і Хрысціна БОНДАРАВА — каардынатары праекта «Шляхецкі баль» у Віцебску. Паўнавартасны бальны сезон, зладжаны дзяўчатамі, упершыню адкрыўся ў 2011 годзе. Восенню адбылося адкрыццё бальнага сезона 2012—2013 гг. Дзяўчаты ладзяць бюджэтныя балі (з вельмі невялікім коштам уваходнага квітка) у Віцебскай філармоніі, у фае тэатра лялек або ў зале цэнтра «Дзвіна». І, трэба сказаць, патанчыць у Віцебск з'язджаюцца аматары з усёй Беларусі.**



Шляхецкі баль у Віцебску. У цэнтры — галоўная натхняльніца Эла ПЕТРАЧЭНКА.

— Мы імкнёмся аднавіць усе формы правядзення вольнага часу XIX стагоддзя, — распавядае Эла, — на жаль, у нашым грамадстве амаль страчана культура танца. А, між іншым, танец — гэта не проста ўменне прыгожа рухацца. Гэта выхаванне музыкай, рухамі, традыцыямі, гісторыяй. Танец — гэта тая нітачка, якая звязвае разам наша мінулае, сучаснасць і будучыню.

Для таго, каб нашыя чытачы выправіляліся на баль падкаванымі карыснымі звесткамі, «Звязда» пацікавілася ў Элы Петрачэнкі, што яна ведае пра бальную традыцыю ў Беларусі. Цяпер гэта будзеце ведаць і вы.

***— Што такое беларускі баль і адкуль ён бярэ свой пачатак?***

— Вельмі складана адказаць на гэтае пытанне сцісла, нягледзячы на тое, што інфармацыі пра беларускую бальную культуру амаль няма. Некалькі гадоў таму, калі я пачала цікавіцца гэтай тэмай, то сутыкнулася з недахопам інфармацыі не толькі пра бальную культуру як частку шляхецкага побыту. Інфармацыі пра беларускую шляхту як клас, яе побыт, перакананні, памкненні вельмі мала. Прыходзіцца збіраць ускосныя звесткі, якія дазваляюць стварыць больш-менш поўную карціну. Напрыклад, вядома, што Пётр І выдаў загад праводзіць асамблеі. Дваране тады збіраліся на гэтыя «мерапрыемствы» неахвотна, спачатку не вельмі разумеючы іх сэнс. І толькі з часам была заўважана іх карысць і прызначэнне. На беларускіх землях такіх загадаў ніхто не выдаваў. Мяне гэта спачатку засмуціла, а потым я зразумела, што такога документа ў нас і не магло быць. У нас музыка і танец ішлі побач. І навошта заканадаўча замацоўваць тое, што шырока распаўсюджана. Гэтую думку даказвае шырока вядомы «Полацкі сшытак» — помнік свецкай музыкі XVII ст. У ім даволі шмат кампазіцый маюць звычайную назву «танец». Можна меркаваць, што гэта не таму, што нашы продкі не ведалі назваў таго, што танцавалі, а якраз наадварот: гэтая танцавальная музыка была настолькі распаўсюджана, што лёгка пазнавалася і не патрабавала дадатковых тлумачэнняў. Можна ўзгадаць і «Дыярыуш» Самуіла Маскевіча, у якім аўтар параўноўвае побыт маскоўскіх баяр і сваіх суайчыннікаў канца XVI-XVII ст. Многае яго здзіўляла, асабліва тое, што ў Маскве падчас піроў і застолляў зусім не танцуюць. У мемуарнай літаратуры шмат звестак пра шыкоўныя балі, якія ладзіліся Радзівіламі ў Нясвіжы. Пра асаблівасць баўлення вольнага часу на Беларусі расказвае П. Шпілеўскі ў кнізе «Падарожжа па Палессі і беларускім краі»: «Ладзяцца ў Мінску на Высокім рынку ў доме Гайдукевіча касіны, то бок танцавальныя сходы». Танцы былі важным элементам шляхецкага побыту XIX стагоддзя. І акрамя балю — самай урачыстай танцавальнай імпрэзы, існавалі рэдуты, кантракты, касіны. У гэтым і заключаецца асаблівасць бальнай культуры Беларусі.

***— Дзе праводзіліся балі?***

— Месца правядзення балю залежала ад саслоўнай прыналежнасці гаспадара і ад часу, пра які мы гаворым. Найбольш поўна бальная традыцыя ў Беларусі аформілася ў XIX стагоддзі, і таму лагічна сцвярджаць, што баль, як самая ўрачыстая і цырыманіялізаваная імпрэза, праводзіўся ў дамах дваран або ў так званых «афіцэрскіх зборнях».

***— Якая гучала музыка?***

— У XIX стагоддзі танцавалі звычайна пад аркестр. У залежнасці ад танцавальнай моды баль мог адкрывацца рознымі танцамі. Найбольшае распаўсюджанне атрымаў паланэз — танец-шэсце, які выконваў прэзентацыйную функцыю.

***— Які быў бальны дрэс-код?***

— Дрэс-код залежаў ад тагачаснай моды і ад тэматыкі, канцэпцыі балю. Напрыклад, да балю-маскараду прад'яўляліся адны патрабаванні, а да тэматычнага балю — зусім іншыя.

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**
**Фота з архіва Элы ПЕТРАЧЭНКІ.**

# НАЗВАЛІ НАЙЛЕПШЫЯ ФІЛЬМЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 5-й стар.)*

Міжнароднае журы кінапрэсы, якое сёлета ўзначальвала Сусанна Аруцюнян, мастацкі кіраўнік Ерэванскага міжнароднага кінафестывалю «Залаты абрыкос», уручыла «Серабро Лістапада» ў намінацыі «Фільм як з'ява мастацтва» стужцы «За ўзгоркамі» румынскага рэжысёра Хрысціяна Мунджу і спецыяльны дыплом журы «За актуальнасць тэмы і дакладнасць кінамовы» стужцы «Пасля Лусіі» мексіканца Мічэля Франка. Прыз за акцёрскі ансамбль атрымала латвійская стужка «Крутая Колка» Юрыса Пошкуса; «За найлепшую жаночую ролю» — актрысы Вольга Лапшына і Яна Траянава за ролі ў фільме Васіля Сігарава «Жыць», «За найлепшую мужчынскую ролю» — Міхаіл Месхі (фільм «Апакун», рэж. Заза Урушадзэ, Грузія).

Па выніках глядацкага галасавання з рэйтынгавым балам 3,78 перамагла польская стужка «Веласіпед майго бацькі» (рэж. Петр Тшаскальскі). Акурат гэты фільм атрымаў трэці — самы галоўны прыз кінафестывалю — «Бронза Лістапада».

Прызы конкурсу гульнявога кіно «Маладосць на маршы», журы якога ўзначальвала амерыканская актрыса і прадзюсар Крысцін Уокер, атрымалі дзве стужкі. Прыз «За найлепшы фільм конкурсу гульнявога кіно «Маладосць на маршы» імя народнага артыста СССР кінарэжысёра Віктара Турава» дастаўся стужцы «Лора» (Аўстралія, Германія, Вялікабрытанія), рэж. Кейт Шортлэнд. Спецыяльны дыплом журы атрымала стужка «Пасля Лусіі» (Мексіка), рэж. Мічэль Франка.

У асноўным конкурсе дакументальнага кіно Гран-пры «За найлепшы дакументальны фільм» атрымаў фільм «Вёска без жанчын» (рэж. Срджан Саранач, Сербія). Спецыяльны прыз журы — фільм «OUTRO» (рэж. Юлія Панасенка, Расія). Таксама журы конкурсу дакументальнага кіно на чале з Галінай Адамовіч уручыла некалькі спецыяльных дыпломаў: "За найлепшы кароткаметражны дакументальны фільм» — фільму «Папарацы» (рэж. Пётр Бернаш, Польшча); «За найлепшы дакументальны фільм-партрэт» — «Мой сябра Манчэстэр Юнайтэд» (рэж. Стэфан Валдобраў, Балгарыя); «За найлепшы фільм пра каханне» — «Наасфера» (рэж. Арчыл Хетагуры, Ілеана Станкулеску, Румынія); «За высокую дакументальную этыку» — «24 вядры, 7 мышэй, 18 гадоў» (рэж. Марыус Якаб, Румынія).

Падрабязней пра фільмы-пераможцы чытайце на старонках нашай газеты ў аўторак.

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.**

# У ЧЫМ ТАЯМНІЦА БЕССМЯРОТНАСЦІ ЗЛА?

**Варыянт адказу з 3D-эфектамі ад стваральнікаў оперы «Кашчэй Бессмяротны»**

**Калі хто не ведае ці ўжо забыўся, пра што Мікалай Рымскі-Корсакаў напісаў твор, то ёсць нагода паслухаць оперу ў новай рэдакцыі на сцэне Вялікага тэатра Беларусі, якая будзе прадстаўлена 10 лістапада.**



